Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

154кр. "Савецкая Беларусь"
ОДЕССА, Пастера, 13
Дзярж. Публічн. бібліят.
студз. сьнежань адзін экз.

БЕЛАРУСКАЯ ВЯСКА

Орган Центральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў)

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.
Неапублікаваныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.

Зьмена адрасу: 1 экзэмпляр — 20 к.
Месяцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АББЕСТКІ:

За радок шапіраслі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок шапіраслі пасьлядо тэксту 1 р. — к.
За радок шапіраслі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьвяшчэнныя ня 50 проц. дарагей.
Зьвыш тэрміну бярэцца 10 проц. наліку.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумэнт — 35 кап.
За кожны дадатковы — 15 „
Беспрацоўн. і сярэднаарміёйцы за дакумэнт — 15 „
За кожны дадатковы — 5 „
Публікацыі ЗАГС'у—3 руб. радок.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддаленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.
АББЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня. — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. — № 139 (2628) Пятніца, 21-га чэрвеня 1929 г.

Зьезд нямецкіх бальшавікоў.

...зьезд нямецкай кампартыі, які ...скончыўся, мае вялізарнае зна... ...е для ўсяго міжнароднага каму... ...чнага руху. Зьезд паставіў перад ...ыяй шырока задачу заваёвы боль... ...ці рабочае клясы. Але, паставіў... ...гэту задачу, як актуальную, зьезд ...льшавіцкай выразнасьцю сказаў, ...гэта заваёва можа адбыцца толькі ...разьвязваньне клясавых боек як ...ніне эканамічнай, так і ў галіне ...ычнай. Было-б ілюзіяй думаць, ...кампартыя можа вырваць кіраў... ...а в рук сацыял-фашыстаў адной ...цыяй і прапагандай.

...гемонам у рабочым руху кампар... ...можа стаць толькі пастолькі, па... ...які яна будзе кіраваць барацьбой ...у эканамічных бойках, у бойках з ...ял-фашызмам, паколькі яна будзе ...ізаваць іх у барацьбе з ваеннай ...ьпекай і ў абароне СССР.

...урскі лёкаут, антыбраняносная ...ванія, бэрлінскія растрэлы і ...лкады—вось важнейшыя фак... ...ы рэвалюцыянізаваньня мас. ...ы зьезд КПН разгарнуў шырокую ...раму барацьбы рабочай клясы і ...ністычнага авангарду. Улічваючы ...т бэрлінскіх падзей, зьезд высу... ...у праблему масавай палітычнай ...кі, як палітычнага сродку ў ба... ...бе з фашызацыяй тройсьцьвеннага ...у—прадпрыёмцаў, дзяржапарату і ...рмістаў. На даным этапе масавая ...ычная стачка зьяўляецца сродкам ...ога згрупаваньня мас, падвядзень... ...х да задачы вышэйшага парадку ...пасрэднай барацьбы за ўладу.

...2-ты зьезд КПН быў яскравай дэ... ...трацыяй рэвалюцыйнага інтэрна... ...ералізму авангарду нямецкага пра... ...ыяту. Зьезд выкрыў імпэрыялі... ...ны характар палітыкі нямецкай ...суазеі, ён сарваў пацыфісцкую ...у праграмы сацыял-фашыстаў і ...заў яе ў сапраўдным сьвеце, як ...раму імпэрыялістычнага ўзброень... ...Нямеччыны, вастрыём накіраваную ...оць СССР.

...дачу мабілізацыі мас да чырво... ...дню 1-га жніўня пад лёзунгамі ...цьбы з імпэрыялістычнымі ўзбро... ...ні і абароны СССР, пад лёзун... ...масавых стачак і дэманстрацый— ...высунуў як цэнтральную задачу бліжэйшых месяцаў. 12-ты зьезд КПН разьбіў усе хлусьлівыя крыкі сацыял-фашыстаў і іх брандлераўскіх падгалоскаў аб „разлажэньні“ кампартыі, яе «іваляцыі» ад мас і г. д.

У сваёй пераважнай большасьці зьезд складаўся з рабочых камуністаў, дэлегатаў буйных прадпрыёмстваў. Зьезд віталі дэлегацыі буйных прадпрыёмстваў. Адчуваючы за сабой падтрыманьне і сымпатыі шырокіх мас, зьезд КПН ні ў якой меры не паслабляў працы. З бальшавіцкаю рашучасьцю ён выкрыў слабасьць партыі ў справе арганізацыйнага абхвату мас. На прадпрыёмствы і перш усяго на буйныя прадпрыёмствы—вось які быў лёзунг зьезду. Зьезд разам з тым паказаў і сапраўдную бальшавіцкую згуртаванасьць нямецкай кампартыі.

Выпікі, якія ён падсумаваў у гадовай барацьбе з правымі і прымірэнцамі, аказаліся для апошніх катастрафічнымі. У працэсе абвастрэньня клясавай барацьбы развяжоўка паміж камунізмам і апартунізмам стварылася надзвычайна хутка. Майскія падзеі правялі глыбокую мяжу паміж кампартыяй, як рэвалюцыйным авангардам пралетарыяту, і правымі агентурай сацыял-фашызму. Правыя апынуліся па-за шэрагамі партыі. Іх роля зараз—роля агентуры сацыял-фашызму па-за партыяй.

Месца правых партый занялі зараз прымірэнцы. Эвэрт і Мэйер—наступнікі Брандлера. Адхіляючы факт сацыял-фашысцкага пераражэньня рэфармізму, мэханічна супроцьпастаўляючы дэмакратыю і фашызм, прымірэнцы слова ў слова паўтараюць аргумэнты брандлераўцаў. Зьезд зрабіў пабальшавіцку, запрапанаваўшы прымірэнцам выбар: або падпарадкавацца, або пакінуць шэрагі партыі.

Зьезд утвараў маналітны, бальшавіцкі згуртаваны ЦК. 12-ы зьезд КПН быў зьездам падрыхтоўкі да будучых рэвалюцыйных боек. 12 зьезд КПН паказаў, што сілы нямецкай рэвалюцыі растуць, што авангард яе мацнее і загартоўваецца.

Прывітаньне баявому атраду Камінтэрну—бальшавікам Нямеччыны!

Кампартыя—жалезная аснова нямецкага пралетарыяту.

...РЛІН, 18-6. Агалошан маніфэст ...у нямецкае кампартыі да працоў... ...мас Нямеччыны. Характарызуючы ...снае палітычнае становішча, мані... ...зазначае: «У Парыжы пры рэпа... ...ійных перамовах нямецкі імпэрыя... ...арабіў рашучы крок да ўваходу ў ...арыстычны фронт супроць Савец... Саюзу. Аднак, нямецкая кампар... ...шчыльна злучаная з гушчаю ра... ...іх на прадпрыёмствах, блізкая да ...етарскіх масавых арганізацый, са... ...ная з усімі прыгнечанымі, няг... ...ная ў барацьбе супроць апарту... ...у ва ўсіх яго формах,—будзе жа... ...лезнаю асновою нямецкага пралетарыяту, жалезным вартаўнікам Савецкага Саюзу, аплотам сусьветнага пралетарыяту.

Рэвалюцыйныя рабочыя ўсіх краін мабілізуюцца да 1-га жніўня пад сьцягам Камінтэрну для магутнае масавае дэманстрацыі за мір, за абарону Савецкага Саюзу, супроць сацыял-фашысцкіх падрыхтоўцаў імпэрыялістычнае вайны, супроць наступу капіталу, за дыктатуру пралетарыяту. Зьезд заклікае працоўныя масы Нямеччыны мабілізавацца для гэтага масавага выступленьня“.

„Лопаты“ Макданальда аб нацменшасьцях

МАКДАНАЛЬД ПАПАЎСЯ Ў „ПАСТКУ“.

...ЭНДАН, 19-VI. У апошнім нумары ...рэвратыўнае „Сэндэй Таймс“ быў ...шчаны артыкул Макданальда аб ...іянальных меншасьцях. Макданальд ...ра крытыкаваў палітыку эўрапей... ...буржуазных дзяржаў у адносінах ...ацыянальных меншасьцяў. Макда... ...д падкрэсьліваў «бесклапотнасьць», ...ою пасьля сусьветнае вайны дзяр... ...а-пераможцы разьмяркоўвалі вобд... ...ці, заселеныя нацыянальнымі мен... ...цямі; між іншым Макданальд за... ...ыў, што асабліва многа такіх ...асьцёў атрымала Польшча, Ру... ...ія і Югаславія.

...дзначаючы, што ледзь не заўсёды ...ціянальныя меншасьці знаходзяцца ...рыгнечаным становішчы, Макда... ...д заяўляў, што ім павінна быць ...на тэрытарыяльная аўтаномія, а ...ама права зварочвацца са скаргамі ...ігі Нацый. Права, на думку Мак... ...льда, павінна належаць нацыянальным меншасьцям ня толькі дзяржаў, якія ўзьнікілі пасьля вайны, але і „такіх старых дзяржаў, як, напрыклад, Італія».

Гэты артыкул Макданальда выклікаў вялікае хваляваньне ў дыплёматычных колах. «Дэйлі Тэлеграф» паведаміла, што „чакаецца“ дыплёматычны пратэст з боку Італіі і Югаславіі, а таксама магчыма будзе пададзен пратэст з боку Францыі і Румыніі.

У хуткім часе выявілася, што гэты артыкул быў напісаны Макданальдам некалькі месяцаў назад і ляжаў у рэдакцыі „Сэндэй Таймс“, а цяпер агалошан газэтаю без яго ведама дзеля сэнсацыі. Макданальд, «каб ухіліцца ад новых непаразуменьняў», забараніў зьмяшчаць свае артыкулы, якія ён напісаў да стварэньня новага ўраду, і якія яшчэ ня былі агалошаны ў друку.

„Вялічэзная памылка Макданальда“.

...АРЫЖ, 19-6. Артыкул Макданаль... ...б нацыянальных меншасьцях,ага... ...ны ў „Сэндэй Таймс“, выклікаў ...мі вострыя камэнтарыі ўсяго фран... ...ага буржуазнага друку.

...газэты зазначаюць, што Макданальд зрабіў „вялічэзную памылку“, зьдзіўляючыся супярэчнасьці, якая існуе між тэзісамі Макданальда і пазіцыяй ангельскага прадстаўніка ў Мадрыдзе на сэсіі рады Лігі Нацый.

...трымацца ад выпадаў супроць Макданальда.

...ЭНДАН, 19-VI. Парыскі карэспан... ...„Манчэстэр Гардыян» піша, што ...д факт прыходу да ўлады ў Ан... ...«рабочае» партыі «дзіўным чынам ...ніў становішча ў Эўропе, асабліва ...ранцыі». Карэспандэнт паведамляе, ...французкае міністэрства за... ...ных спраў зьвярнулася да ...нцускіх газэт з зазначэньнем ...еабходнасьць устрымацца ад выпадаў супроць Макданальда ў сувязі з агалашэньнем у „Сэндэй Таймс» яго другога артыкулу па пытаньні аб нацыянальных меншасьцях.

„Як відаць,—паведамляе карэспандэнт,—Францыя ня будзе адкрыта выступаць супроць палітыкі ангельскага габінэту і будзе імкнуцца згаварыцца з ім або абыйсьці яго якім-небудзь іншым шляхам“.

Водгукі на ліст Макданальда ў Італіі.

...ІМ, 18-6. Артыкул Макданальда ...цыянальных меншасьцях зрабіў у ...і вялікае ўражаньне. Некаторыя ...спандэнты італьянскіх газэт зада... ...юць кусьлівыя запытаньні наконт адносін Макданальда да нацыянальных меншасьцяў Індыі, Мальты і іншых калёній.

ХВАЛЯ ЗАБАСТОВАК У ПОЛЬШЧЫ

Барыкадныя бойкі у Пабяніцах.

ВАРШАВА, 19-6. У Пабяніцах на тэкстыльнай фабрыцы Крушэ і Эндэра здарылася крывавая сутычка рабочых з паліцыяй. Два тыдні назад рабочыя фабрыкі Крушэ і Эндэра наладзілі дэманстрацыю пратэсту супроць скарачэньня вытворчасьці. У адказ адміністрацыя звольніла некалькі рабочых, якіх яна лічыла правадырамі дэманстрацыі. У знак салідарнасьці са звольненымі рабочыя забаставалі і захапілі фабрычны двор.

Адміністрацыя выклікала паліцыю. Тады рабочыя пабудавалі на двары барыкады. Прыехаўшая конная паліцыя атакавала барыкады. Рабочыя закідалі паліцыю каменьнямі. Ледзь удалося паліцыі ачысьціць двор. У часе сутычкі паранена 6 рабочых і 4 паліцэйскія, а таксама некалькі коняй паліцыянтаў. Пасьля разгону бастуючых адміністрацыя фабрыкі абвясьціла, што фабрыка будзе зачынена на невядомы час. На вуліцу выкінута 4 тысячы рабочых.

Бурная дэманстрацыя беспрацоўных.

СУТЫЧКА З ПАЛІЦЫЯЙ. СЯРОД РАБОЧЫХ ЁСЬЦЬ МНОГА ПАРАНЕНЫХ

ВАРШАВА, 20-VI. Сёньня газэты паведамляюць пра новыя непакоі беспрацоўных у Лодзі. Некалькі сотняў беспрацоўных сабраліся перад памяшканьнем гарадзкое ўправы і патрабавалі, каб управа, якою кіруюць пэпэсаўцы, арганізавала грамадзкую працу. Атрымаўшы адмову, беспрацоўныя спрабавалі тры разы ўвайсьці ў памяшканьне ўправы, але выкліканая пэпэсаўцамі паліцыя разагнала іх. Адзін рабочы паранен цяжка, некалькі чалавек—лёгка. Зроблены шматлікія арышты.

4 ТЫСЯЧЫ РАБОЧЫХ ВЫКІНУТА НА ВУЛІЦУ.

ВАРШАВА, 20-VI. На тэкстыльнай фабрыцы Крушэ і Эндэра ў Пабяніцах, дзе ўчора адбываліся буйныя крывавыя сутычкі рабочых з паліцыяй, фабрычная адміністрацыя звольніла ўсіх рабочых у колькасьці 4-х тысяч чалавек. У горадзе ня спыняецца дэманстрацыя звольненых рабочых.

Бастуе 2.000 рабочых.

ВАРШАВА, 20-6. З Кракава паведамляюць, што прадпрыёмцы цагельнянага выплачваюць рабочым іх мізэрнага заработку. Фабрыканты знарок імкнуцца выклікаць канфлікт з рабочымі, каб павялічыць цану на цэглу.

Рабочыя ў ліку 2.000 абвясьцілі забастоўку, патрабуючы неадкладнай выплаты затрыманага заработку, увядзеньня 8-мігадзіннага дню працы і павялічэньня заработку.

Забастоўка на фабрыцы вырабу самаходаў.

ВАРШАВА, 20-6. Бастуе паўтары тысячы рабочых фабрыкі вырабу самаходаў. Рабочыя патрабуюць павялічыць ім заработак, палепшыць умовы працы і ўвесьці 8-мігадзінны дзень працы.

Напярэдадні адмовы ў працы 3.000 гарняком.

ВАРШАВА, 20-6. Капальня жалезнае руды «Сімезія» ў Парышоўцы некалькі тыдняў засаб сыстэматычна скарачае рабочы тыдзень, у выніку чаго рабочыя зарабляюць 20-30 злотых у тыдзень.

Гэтымі днямі прадпрыёмцы абвясьцілі рабочым, што яны зачыняюць прадпрыёмства і адмовяць у працы 3.000 рудакопам. Рабочыя рыхтуюцца да абвяшчэньня забастоўкі.

ЗАБАСТОЎКА Ў ЛОДЗІНСКІМ БАНКУ.

ВАРШАВА, 20-6. Газэта „Глос Правды“ паведамляе, што ў лодзінскім дэпазытным банку выбухнула дэманстрацыйная забастоўка в патрабаваньнем павялічэньня заработку. Бастуюць усе працаўнікі банку. Заработак іх вельмі малы (120—220 злотых), якога не хапае на пражыцьцё.

ДРУЖНЫ АДПОР САЦЫЯЛ-ФАШЫСТАМ.

ВАРШАВА, 19-6. Напярэдадні выбараў у больнічную касу Пабяніц туды прыехаў лідэр адколатае правае фракцыі ППС Яваройскі з 20-цю дружыньнікамі. Яваройскі склікаў мітынг, але рабочыя не далі яму гаварыць. Дружыньнікі кідаліся зьбіваць рабочых, але былі імі абязброены. Нарэшце, рабочыя зьбілі Яваройскага і дружыньнікаў і прагналі іх са сходу.

ПРАЦЭС УКРАІНЦАЎ У ЛЬВОВЕ.

ВАРШАВА, 19-VI. У Львове распачаўся працэс 21. Усе падсудныя абвінавачваюцца ў прыналежнасьці да кампартыі Заходняе Украіны. Усе яны арыштаваны летась увосень.

НА ЛАВЕ ПАДСУДНЫХ—УКРАІНСКІЯ СЯЛЯНЕ.

ВАРШАВА, 19-VI. 17-га чэрвеня ў акруговым судзе Львову распачаўся разгляд справы 7-мі ўкраінцаў, якія абвінавачваюцца ў прыналежнасьці да украінскае баявое арганізацыі і ў антыпольскіх выступленьнях на ўрачыстасьцях, прысьвечаных 10-м угодкам незалежнасьці Польшчы.

ЗАМАХ НА ВЫКЛАДЧЫКА.

ВАРШАВА, 17-VI. Як паведамляе «АБЦ», у Львове ўчынен замах на выкладчыка украінскай гімназіі Буткевіча. Буткевіч—паляк, які варожа адносіўся да украінцаў, паранен.

Па западозраньні ў забойстве арыштаваны вучань 7 клясы Пасяка.

АДЗІНЫ ФРОНТ БУРЖУАЗІІ І „САЦЫЯЛІСТАЎ“ ПРОЦІ РАБОЧЫХ

Францускія „сацыялісты“—здраднікі рабочае клясы.

ПАРЫЖ, 19-VI. У палаце дэпутатаў распачалося абмеркаваньне законапраэкту аб абавязковым прымірэчным разборы пры канфліктах між рабочымі і прадпрыёмцамі. Сацыяліст Ляфэй заявіў, што сацыялісты будуць галасаваць за законапраэкт, бо ён „пазбаўляе камуністаў і дзеячоў унітарных прафсаюзаў магчымасьці абвастраць працоўныя канфлікты“.

Далей Ляфэй заявіў, што забастоўкі „зьяўляюцца небясьпечнай зброяй, якая павінна адмерці па меры росту сацыяльнае справядлівасьці, які ўжо ажыцьцяўляецца“.

Камуністычны дэпутат Пікемаль, выступаючы супроць законапраэкту, сказаў: „Ва ўмовах капіталістычнае гаспадаркі, калі кожны ўгавор аб заработку зьяўляецца толькі часовым кампрамісам, толькі забастоўка можа быць сапраўднай зброяй у руках рабочае клясы. Усе спробы абмежаваць правы рабочых на забастоўку аднолькава небясьпечныя для рабочае клясы, бо абавязковыя перамовы прымушаюць рабочых адкладаць забастоўку, і даюць гэтым самым прадпрыёмцам магчымасьць падрыхтоўвацца да забастовак і рабіць іх мала шкоднымі для сябе. Прапанаваны парадак прымірэнчага разбору няўхільна абернецца ў прымірэнчы арбітраж, пры якім вярхоўным трацейскім судзьдзёю будзе дзяржаўная ўлада, салідарная з прадпрыёмцамі“.

Разгон мітынгаў і арышты рабочых.

ВЕНА. 17-VI. Назначаны кампартыяй масавы мітынг пратэсту ў дзень абмеркаваньня законапраэкту парляманту забаронен быў паліцыяй. Забарона пацьверджана сацыял-дэмакратычным бургомістрам Вены Зэйцам.

Райённыя мітынгі пратэсту таксама разагнаны былі паліцыяй, пры гэтым здарылася некалькі сутычак. Арыштавана блізка 20-ці рабочых, у тым ліку сябра ЦК аўстрыйскае кампартыі Цыглер і 4 працаўнікі аўстрыйскага камсамолу. Паліцыя бяз ніякай прычыны пушчала ў ход гумовыя дубінкі. Не зважаючы на перашкоды паліцыі, у некаторых райёнах адбыліся лятучыя мітынгі пратэсту.

Прасьледваньне Чэха-Славацкай кампартыі.

ПРАГА, 18-VI. Сыстэматычныя паліцэйскія прасьледваньні кампартыі ня спыняюцца. Пасьля масавых вобыскаў у Празе адбыліся такія-ж вобыскі ў Брно, цэнтральным горадзе Маравіі. Фармальная прычэпка была тая-ж, што і ў Празе—шуканьне брашуры «Ад ліквідатарскага легалізму да бальшавіцкага актывізму». Паліцыя карыстаецца гэтаю прычынаю для спробы дэзарганізаваць партыю і атрымаць як мага больш вестак аб унутрыпартыйнай дзейнасьці, асабліва ў зьвязку з падрыхтоўкаю да 1-га жніўня.

Апроч таго, ужываюцца паліцэйскія захады, якія маюць на мэце стварыць магчымасьць для поўнае забароны камуністычнага друку. Зачынена і знаходзіцца пад нагрозаю шмат часопісаў і газэт. Адначасна распачалося цкаваньне кампартыі ў прэсе, на гэты раз з боку левабуржуазнай і так званай «сацыялістычнай» прэсы, якая блізка стаіць да прэзыдэнта Масарыка і міністра замежных спраў Бэнэса.

Сац.-фашысты душаць камуністычную прэсу

БЭРЛІН, 18-6. Паліцыя забараніла Магдэбурскі орган нямецкае кампартыі «Трыбуна» на 3 тыдні за перадавы артыкул пад загалоўкам: «За барацьбу супроць вайны караюць», а таксама за зьмяшчэньне прамовы прадстаўніка Выканкому Камінтэрну т. Сэмара на зьезьдзе нямецкае камуністычнае партыі.

Усеагульная забастоўка ў Пірэйскім порце.

АТЭНЫ, 18-VI. Забастоўка партовых грузчыкаў, якія дамагаюцца павялічэньня заработку, ня спыняецца. Пад старшынствам Вэніэлоса адбылася нарада між уласьнікамі суднаў і рабочымі, аднак, згоды не дасягнута. У зьвязку з гэтым сёньня ў Пірэйскім порце абвешчана ўсеагульная забастоўка.

Сутычкі паміж бастуючымі і штрэйкбрэхерамі.

АТЭНЫ, 19-VI. У Пірэйскім порце, дзе адбываецца ўсеагульная забастоўка, працуе каля тысячы штрэйкбрэхераў. Учора між бастуючымі і штрэйкбрэхерамі здарылася сутычка. У справу ўмяшалася паліцыя. У выніку сутычкі 15 чалавек паранена.

* * *

АТЭНЫ, 19-VI. Атэнскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: „Падпісана згода між уласьнікамі суднаў і бастуючымі партовымі рабочымі аб сканчэньні забастоўкі.

Загад супроць камунізму.

АТЭНЫ, 19-VI. Грэцкі парлямант ухваліў у другім чытаньні законапраэкт супроць камунізму.

Рост рэвалюцыйнага руху гарнякоў.

ЛЁНДАН. У Карніцы адбылося пасяджэньне аб'яднанае прымірэнчае палаты вугольнае прамысловасьці Паўднёвага Уэльсу. Абмяркоўвалася пытаньне аб падпісаньні новае згоды між прадпрыёмцамі і гарнякамі.

Прадстаўнікі федэрацыі гарнарабочых Паўднёвага Уэльсу дамагаліся ўтварэньня нацыянальнае (агульна-ангельскае) умовы, а ня шэрагу асобных умоў па акругах. Прадпрыёмцы ня высунулі контр-прапаноў, але пасьля пасяджэньня агаласілі афіцыйную заяву, у якой зазначаюць, што яны ня лічаць магчымым праводзіць перамовы аб нацыянальнай згодзе і што згоды павінны ўтварацца па акругах.

ПЛЯН ЮНГА НЕ ЗАЦЬВЕРДЖАН.

НЬЮ-ЁРК. 19-VI. Афіцыйная заява, агалошаная кангрэсам, паведамляе, што згода аб рэпарацыях ня будзе падпісана Злучанымі Штатамі. У заяве зазначана, што кангрэс павінен зацьвердзіць толькі адзін пункт згоды—аб зьменшаньні сумы амэрыканскіх прэтэнзій да Нямеччыны на ўтрыманьне акупацыйнае армії. (Сучасная згода па гэтым пытаньні была праведзена праз кангрэс).

Водлуг чутак, Гувэр мяркуе падпісаць з Нямеччынаю асобную згоду па гэтым пытаньні, Такім парадкам, Злучаныя Штаты будуць падтрымліваць плян Юнга, не ратыфікуючы яго, бо на кангрэсе ёсьць уплывовая група, якая супярэчыць супроць афіцыйнага ўдзелу Злучаных Штатаў у банку міжнародных разьлікаў і г. д.

Амэрыка не прызнае залежнасьці рэпарацый ад даўгоў.

ПАРЫЖ, 19-6. Адмова Гувэра падаць плян Юнга на ратыфікацыю амэрыканскага ўраду або сэнату вытлумачваецца францускім друкам, як жаданьне Злучаных Штатаў яшчэ раз падкрэсьліць, што яны не прызнаюць ніякае сувязі між рэпарацыямі і міжсаюзьніцкімі даўгамі.

Друк падкрэсьлівае, што заява Гувэра аб адмове падаць плян Юнга на ратыфікацыю была зроблена адначасна з рашэньнем францускага ўраду прыняць плян Юнга. У зьвязку з гэтым друк непакоіцца, што пазіцыя Амэрыкі яшчэ больш перашкодзіць ратыфікацыі францускіх даўгавых згод у францускай палаце дэпутатаў.

Група Франклен-Буйёна, якая ўваходзіць ва ўрадавую большасьць, дамагаецца адкладу ратыфікацыі даўгавых згод да таго часу, пакуль плян Юнга ня будзе ратыфікаваны ўсімі зацікаўленымі дзяржавамі.

РЭЗАЛЮЦЫЯ БЮРО ЦК КП(б)Б

аб выніках росту і рэгуляваньні сацыяльнага складу КП(б)Б за паўгодзьдзе з 1-га кастрычніка 1928 г. да 1-га красавіка 1929 г.

ад 14 чэрвеня 1929 г.

1. Заслухаўшы даклад Аргаддзелу аб выніках росту і зьменах у сацыяльным складзе КП(б)Б на 1-га красавіка 1929 г., ЦК канстатуе, што тэмп росту, як па колькаснаму, так і якаснаму складу зьвяўляецца яшчэ зусім невыстарчальным і не забясьпечвае выкананьня дырэктывы XII зьезду КП(б)Б аб давядзеньні да канца 1930 г. процанту вытворчых рабочых і батракоў у складзе ўсёй КП(б)Б да 50 пр.

2. Партарганізацыі на месцах яшчэ не дабіліся належнага пералому ў справе ўзмацненьня вярбоўкі рабочых на буйных прадпрыёмствах, а таксама ўцягненьня ў партыю батракоў і с.-г. рабочых. Асабліва адстае праца па вярбоўцы ў партыю вытворчых работніц, нават на тых прадпрыёмствах, дзе пераважна ўжываецца жаночая праца, і зусім слаба ідзе вярбоўка ў партыю батрачак і с.-г. работніц, а таксама сялян-беднякоў і батракоў.

3. ЦК асабліва адзначае слабы тэмп вярбоўкі ў партыю вытворчых рабочых па Віцебскай арганізацыі і адставаньне процанту вытворчых рабочых у складзе прымаемых у партыю па Менскай арганізацыі, якая не забясьпечыла ў агульным складзе прымаемых у партыю 90 проц. рабочых ад вытворчасьці. Слаба ідзе ўцягненьне работніц ад варштату па Віцебскай і Бабруйскай арганізацыях і зусім слабое ўцягненьне батракоў і с.-г. рабочых па Магілеўскай і Полацкай арганізацыях. ЦК таксама адзначае зусім слабую вярбоўку ў партыю рабочых на такіх буйных прадпрыёмствах, як „Дзьвіна“, „Прафінтэрн“, „Чырвоны Мэталіст“ (Віцебск), „Чырвоная Бярэзіна“ (Н.-Барысаў), „Герой Працы“ (Добруш).

4. ЦК адзначае, што галоўнай прычынай невыстарчальнага прытоку ў партыю рабочых і работніц ад варштату і батракоў зьяўляецца ўсё яшчэ недастатковая ўвага з боку АК і РК, і асабліва з боку нізавых партячэек, пытаньням рэгуляваньня росту і справе арганізацыі практычнай дапамогі з боку АК і РК нізавым вытворчым і вясковым ячэйкам у пастаноўцы сыстэматычнай вярбоўкі ў партыю рабочых, батракоў і с.-г. рабочых. Практычная рэалізацыя канкрэтных мерапрыёмстваў, вызначаных лютаўскімі пастановамі ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б аб узмацненьні працы па выяўленьні, палітычным выхаваньні рабочага і батрацкага актыву на месцах яшчэ праходзіць слаба. Пытаньнямі вярбоўкі ў партыю рабочых і батракоў усё яшчэ займаюцца, галоўным чынам, асобныя ніруючыя працаўнікі ў ячэйках, а на ўсю ячэйка цалкам. Усё яшчэ адсутнічае сыстэматычная плянавая праверка і вывучэньне росту ў паасобных райёнах, ячэйках, буйных прадпрыёмствах.

Выходзячы з гэтага, ЦК прапануе:

1. Усім партарганізацыям значна ўзмацніць увагу пытаньню рэгуляваньня росту і зараз-ма прыняць шэраг мерапрыёмстваў да найхутчэйшай рэалізацыі вызначаных у лютаўскіх пастановах ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б канкрэтных мерапрыёмстваў у галіне рэгуляваньня росту і ўзмацненьня тэмпу вярбоўкі рабочых і батракоў у партыю.

2. Усім АК і РК у першую чаргу правесьці наступнае:

а) у найкарацейшы тэрмін удакладніць для паасобных райёнаў процанты рабочых, батракоў і с.-г. рабочых, якія неабходна забясьпечыць у складзе прымаемых у партыю, не дапушчаючы, аднак, ні ў якім разе вызначэньня лічбовых плянаў прыёму.

б) АК і РК забясьпечыць сыстэматычны нагляд за якасным складам прымаемых у партыю па асобных ячэйках і сыстэматычна вывучаць цягу ў партыю з боку розных пластоў рабочых.

в) Асаблівую ўвагу зьвярнуць на пытаньне масавай працы на прадпрыёмствах у савгасах, калгасах і сярод батрацтва. Прыняць усе неабходныя меры да палепшаньня якасьці і палітычнага зьместу штодзённай масавай працы.

г) Практычна прапрацаваць пытаньне аб перабудове масава-выхаваўчай работы на прадпрыёмствах з пераважнай альбо значнай колькасьцю работніц, прыстасаваўшы гэткую да ўзросту і бытавых умоў апошніх.

д) У хутчэйшы тэрмін рэалізаваць дырэктыву ЦК аб перагляде дэлегатак выпуску 1927-28 г. і падрыхтоўцы лепшай частні да ўступленьня ў партыю.

е) Вызначыць практычныя меры па арганізацыі ячэек у савгасах і калгасах, праверыць практычную работу па лініі саюзу с.-г. рабочых у галіне падрыхтоўкі батракоў і с.-г. рабочых у партыю.

ж) АК і РК практычна прапрацаваць пытаньне аб арганізацыйным узмацненьні нізавой партработы на прадпрыёмствах, больш рашуча практыкаваць прымацаваньне адказных партпрацаўнікоў на доўгую работу ў нізавых ячэйках у мэтах практычнай дапамогі апошнім у пастаноўцы масавай працы і сыстэматычнай вярбоўкі рабочых ад варштату, з вялікім вытворчым стажам, прымаданых на вытворчасьці і найбольш клясава сьвядомых—у партыю. У першую чаргу правесьці пасылку адказных партработнікаў у тыя ячэйкі буйных прадпрыёмстваў, дзе ў вучасны момант зусім слаба праходзіць вярбоўка рабочых у партыю.

3. АК і Райкомам строга сачыць за дакладным выкананьнем рашэньня ЦК аб скарачэньні тэрміну па афармленьні прыёму ў партыю, ні ў якім разе не дапускаючы зацяжкі рашэньняў па прыёму рабочых і батракоў звыш устаноўленага тэрміну.

4. АК, РК і ўсім партячэйкам сачыць за правільнай нагрузкай практычнай працай зноў прыняватых у партыю рабочых і батракоў, ні ў якім разе не дапускаючы праваўмернай перагрузкі таварышоў, улічваючы пры гэтым здольнасьць і бытавыя ўмовы кожнага асобнага таварыша.

5. На працягу бліжэйшага часу абгаварыць на ўсіх вытворчых і вясковых ячэйках лютаўскія пастановы ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б пад кутом вызначэньня практычных мерапрыёмстваў па іх рэалізацыі. На ўсіх сходах па перавыбарах бюро ячэек і партыйных канферэнцыях і сходах звярнуць увагу на пытаньні ўзмацненьня тэмпу вярбоўкі рабочых і батракоў у партыю і канкрэтных мерапрыёмстваў у гэтым напрамку.

6. ЦК зварочвае ўвагу Менскага і Аршанскага АК на неабходнасьць у далейшым больш строгага абмежаваньня прыёму служачых.

7. Даручыць Інфармацыйнаму п-аддзелу ЦК і АК КП(б)Б арганізаваць сыстэматычнае асьвятленьне ў „Известиях ЦК ВКП(б)“, „Вістках ЦК КП(б)Б“ і ўсім лярыдычным друку вынікаў росту і ходу вярбоўкі ў партыю рабочых, батракоў і с.-г. рабочых, бедняноў, калгасьнікаў у паасобных райёнах і ячэйках; высьвятляць на старонках друку становішча вопыт паасобных ячэек, асабліва буйных прадпрыёмстваў, вясковых ячэек, асабліва савгасных і калгасных, пастаноўку масавай работы і ўсёй работы па вярбоўцы ў партыю.

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

Дэлегацыя ў т. т. Сталіна і Молатава.

МАСКВА, 18-га чэрвеня дэлегацыя, вылучаная вытворча-гандлёваю нарадаю лясное прамысловасьці, наведала сакратароў ЦК УсеКП(б) т. т. Сталіна і Молатава. У гутарцы з дэлегацыяй т. т. Сталін і Молатаў зазначылі на неабходнасьць зрушыць з мёртвага месца пытаньне аб забясьпецы лясное прамысловасьці адпаведнаю сыравінаю базаю, якая гарантуе як выкананьне нашага экспартнага пляну, так і выкананьне пляну ўнутранага будаўніцтва.

Бліскучыя вынікі сацыялістычнага спаборніцтва

АРЦЁМАЎСК, 19-VI. Канстантынаўскі люстравы завод у выніку сацыялістычнага спаборніцтва выканаў прамысловы плян за 2-гі квартал з перавышэньнем на 39 проц. Сабекошт прадукцыі зьнижан супроць заданьня на 2 проц. Прагулы на заводзе зусім спыніліся.

Фонд дапамогі сацыялістычнаму спаборніцтву.

МАСКВА, 19-VI. ЦК саюзу горнарабочых і Галоўтаапал ВСНГ СССР падпісалі згоду аб заснаваньні фонду дапамогі сацыялістычнаму спаборніцтву ў горнаапалавай прамысловасьці, каменнавугольнай, нафтавай, тарфянай і мінэральнае сыравіны. Фонд заснаваецца не пазьней 20-га чэрвеня у лік меркаванай эканоміі ад правядзеньня сацыялістычнага спаборніцтва ў 1929-30 годзе.

Згода прадугледжвае да канца году 40 проц. усне эканоміі ад сацыялістычнага спаборніцтва. У лік гэтае эканоміі вылучаецца неадкладна адначасовы фонд праз адлічэньні паўпроцанту гадавое сумы заработку. Адначасовы фонд складае паўтараста мілёнаў рублёў. Фонд дапамогі сацыялістычнаму спаборніцтву прызначаецца на выдачу прэмій прадпрыёмствам і ўстановам, якія выявілі лепшы ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве.

За бесперапынны тыдзень працы.

ХАРХАЎ. 19-VI. Рабочыя шэрагу прадпрыёмстваў аднадушна выказваюцца за ўстанаўленьне бесперапыннага тыдню працы. Спэцыяльная нарада саюзаў, якая адбылася пры УЦСПС, прапануе вытворчы год устанавіць у 360 дзён. Рабочыя, на думку нарады, павінны працаваць 5

САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА

ЯШЧЭ НІ АДЗІН КАЛГАС У ЗАСЛАЎСКІМ РАЙЁНЕ НЯ ЎСТУПІЎ У СПАБОРНІЦТВА. ПЕРШЫМ УСТУПІЎ У СПАБОРНІЦТВА САВГАС ТАРАСАВА. САВГАС НОВЫ ДВОР ПРЫНЯЎ ВЫКЛІК САВГАСУ ТАРАСАВА, АЛЕ ПАРТЯЧЭЙКА САВГАСУ, РАБАЧКОМ І АДМІНІСТРАЦЫЯ З „ПРОХЛАДЦЕМ" СУСТРЭЛІ ТАРАСАЎСКУЮ ДЭЛЕГАЦЫЮ. ГЛУСКІ І ПАРЫЦКІ РАЙЁНЫ ЎСТУПІЛІ Ў СПАБОРНІЦТВА.

Першымі вышлі тарасаўцы.

Яшчэ не расначаліся.

Толькі зараз загаварылі ў Заслаўскім райёне аб сацыялістычным спаборніцтве і то толькі па лініі партыйнай арганізацыі. Іншыя ўстановы і арганізацыі яшчэ зусім аб гэтым ня думаюць. Такая сустрэча ініцыятывы пралетарыяў гораду і прывяла да таго, што цэлы шэраг каапэрацыйных, вытворчых арганізацый, калгасаў, савгасаў дасюль ня ўступілі ў сацыялістычнае спаборніцтва, у той час, калі зграмаджаны сэктар павінен зьяўляцца настрольшчыкам у гэтым пытаньні. Былі адзінкавыя выпадкі ўступленьня ў спаборніцтва, але гата быў стыхійны выбух без належнай падрыхтоўкі пытаньня

Першы—савгас Тарасава.

З чатырох савгасаў, якія ёсьць у райёне, першымі загаварылі аб сацыялістычным спаборніцтве рабочыя савгасу Тарасава. Абгаварыўшы дэталёва гэта пытаньне на двух агульных сходах з папярэдняй падрыхтоўкай пытаньня ў рабачкоме і вытворчай камісіі, рабочыя савгасу Тарасава пастанавілі па цэлым шэрагу пытаньняў выклікаць на сацыялістычнае спаборніцтва савгас Новы Двор, аб чым іх і паведамілі.

Для перадачы выкліку абралі дэлегацыю з рабочых, якая ў нядзелю 16 чэрвеня і накіравалася ў савгас Новы Двор. Ініцыятыву тарасаўскай дэлегацыі пры ўезьдзе ў савгас Новы Двор спаткала струмень халоднага ветру.

Новадворскі халадон.

Паведамленьне аб тым, што прыедзе дэлегацыя савгасу Тарасава з выклікам на сацыялістычнае спаборніцтва, зя прымусіла і вокам маргнуць ні рабочых, ні адміністрацыю Новага Двара. Распарадак іх асабістага жыцьця быў непарушаны. Кіраўнік савгасу зраньня накіраваўся ў сельсавет, а старшыня рабачкому, як і заўсёды ў выхадныя дні, захапіўшы ў кішэню ключ ад клюбу і кавалак хлеба, на цэлы дзень накіраваўся „ў рыбу". Чытач думае: нікада, што там ячэйкі няма. Выбачайце, партячэйка ёсьць з 8 асоб, і кіраўніцтва—усё партыйнае, і напярэдадні прыезду тарасаўскай дэлегацыі (г. зн. у суботу) адбыўся агульны сход ячэйкі, але, на вялікі жаль, і ячэйка палічыла пытаньне аб сацыялістычным спаборніцтве і факт прыезду тарасаўцаў настолькі дробнай справай, што ніводнага слова на сходзе аб гэтым ня было.

Тарасаўцы да паловы восьмага бяспрытульнымі хадзілі па двары. Некаторыя выкарысталі момант і ўздрамнулі, бо дома з самага раньня зьбіраліся ў дарогу і не даспалі. Да вечара ўсе захварэлі аднэй хваробай—„кішкі марш зайгралі". Частка дэлегатаў не дачакалася гаспадароў і накіравалася дамоў.

Памылка была выпраўлена.

Калі вярнуліся дамоў кіраўнік савгасу і рабачком і ўбачылі становішча, у якім апынулася тарасаўская дэлегацыя, тады толькі зразумелі, што зрабілі неабдумана. Але памылка была выпраўлена: зараз-жа склікалі агульны сход, на якім абгаварылі выклік тарасаўцаў у сацыяналістычнае спаборніцтва.

Рабочы калектыў савгасу Новы Двор прыняў выклік рабочых савгасу Тарасава, добра разумеючы, што сацыялістычнае спаборніцтва зьяўляецца лепшым мэтадам уцягненьня ў сацыялістычнае будаўніцтва шырокіх рабочых мас і самаправеркі сваёй работы. Рабочыя выправілі памылку сваіх кіраўнікоў, якія не даацанілі такой вялікай справы.

У наступную нядзелю дэлегацыя новага Двара выяжджае ў Тарасава для заключэньня дагавору на спаборніцтва.

Пачын зроблен.

Зроблены пачын рабочымі савгасаў Тарасава і Новы Двор, а таксама асьветнікамі, якія на райённай канфэрэнцыі пастанавілі, каб усе школы ўступілі паміж сабою ў сацыялістычнае спаборніцтва за лепшую пастаноўку як унутрышкольнай, так і грамадзкай працы школы, павінен знайсьці водгук у іншых арганізацыях райёну. Ні ў якім раз не павінны адстаць іншыя савгасы, калгасы і розныя віды каапэрацыі, якія павінны зьявіцца прыкладам для неаграмаджанай часткі вёскі.

Ян Чарнецкі.

Ратамка.

СПАБОРНІЦТВА РАЙЁНАЎ.

(З блёк-ноту агранома).

Шмат вёсак, пасёлкаў і калгасаў уступаюць у сацыялістычнае спаборніцтва. Але сёньня хочацца сказаць пра тыя райёны, якія першымі ўступілі ў спаборніцтва, заключыўшы паміж сабою дагаворы. Гэта Глускі і Парыцкі райёны Бабруйскай акругі.

9 чэрвеня працаўнікі двух райёнаў зьехаліся ў камуне „Юны Камунар", каб лепш выканаць заданьне ўраду па барацьбе за лепшы ўраджай, за палепшаньне вытворчасьці сельскай гаспадаркі.

Грае духавы аркестр. Усё больш і больш зьбіраецца моладзі і старых сялян з вёсак і хутароў.

Доўга абгаварвалі кожны пункт дагавору і, урэшце, была прынята наступная пастанова.

Па сельскай гаспадарцы ўзьняць ураджай на 10 проц., пасеўную плошчу пашырыць на 5 проц., ачысьціць насеньне ўвосень Парыцкаму райёну—30 проц., Глускаму—50 проц., вясной—100 проц.; засеяць гатунковым насеньнем 31,8 проц.; кармавымі расьлінамі: Глускі райён—25 проц., Парыцкі—15 проц.; перавесьці на шматпольле—20 проц., арганізаваць на 4 пракатныя пункты, злучных пунктаў арганізаваць 10, конскіх—8, з баравамі—4. Зрабіць насадку групавых садоў на 10 гэкт. Арганізаваць па 8 калгасаў на 2500 гэктарах, малочных таварыстваў дагнаць да 15, машынных—Глускі райён—да 25, Парыцкі—да 30, пасялковых таварыстваў да 10, мэліарацыйных да 12. Арганізаваць торфараспрацоўчых т-в: Глускаму райёну—10, Парыцкаму—5. Збор попелу праводзіць. Каморнікі зьверх пляну бяруцца земляўпарадкаваць бясплатна па аднэй вёсцы на плошчы 800 гэктараў.

Па асьвеце ахапіць дзяцей школьнага ўзросту 70 проц., з іх дзяцей беднаты—80 проц. Дабіцца выпуску з школ 90 проц. вучняў, ліквідаваць няпісьменнасьць: Глускі сярод 2500 чал., Парыцкі—1300 чал. Давесьці выпіску газэт па 1 па 5 дваро́ў. Паставіць на грамадзкія сродкі радыёўстаноўкі: Парыцкі райён ва ўсіх сельсаветах і калгасах, Глускі—10 радыёўстановак. Прапусьціць праз школы малапісьменных па 450 чал.

Па камунальнаму будаўніцтву арганізаваць па 3 агнятрывалыя т-вы, папоўніць пажарныя дружыны па 1 капл. інвэнтара, правесьці агнятрывалае будаўніцтва: Глускаму райёну пабудаваць 15 сялянскіх хат, Парыцкі райён—40 хат. Па 3 с-с. прывесьці дарогі ў належны парадак і электрыфікаваць па 1 калгасу.

Каапэраваць насельніцтва на 85 проц., павялічыць паявы капітал на 80 проц., каапэраваць беднату на 100 пр., правесьці калектыўную здачу с.-г. прадуктаў у адносінах да загатовак на 30 проц.

Па КСУ утварыць фонд збожжа ў 10.000 пудоў, ліквідаваць запазычанасьць па сяброўскіх узносах на 100 проц. Аказаць дапамогу беднякам 625 чал.

Па каштарысах райёнаў выканаць прыбытковую частку на 100 проц., вывяць новыя крыніцы абкладаньня на 5 проц., скараціць гаспадарчыя выдаткі, спагнаць с-г. падатак поўнасьцю, правесьці самаабкладаньне і і земляўпарадкаваньне па пляну, правесьці поўны вучот аб'ектаў ападаткаваньня.

Акрамя гэтага, пастанавілі аказваць адзін другому дапамогу ўсякім насеньнем, правесьці растлумачальную працу па вёсках і правяраць выкананьне ўмовы праз 3 месяцы. Для гэтай працы выдзелілі па 2 чалавекі з райёну і адзін з акругі. **Алесь Дымкаў.**

Уступілі і выклікаюць.

Служачыя Віцебскага Акруговага Суду і Нарсуду г. Віцебску выклікаюць на спаборніцтва Гомельскі Акруговы Суд і Нарсуды г. Гомелю па пытаньнях па якіх выклікаецца Вярхоўны Суд, а таксама па наступных пытаньнях: Узмацніць працоўную дысцыпліну. Сваечасова пачынаць судовыя пасяджэньні. Дабіцца мінімальнага адкладваньня спраў шляхам ласканалай падрыхтоўкі іх да слуханьня. Рацыянальна скарыстоўваць канц. прылады і паштовыя выдаткі, зьнізіўшы іх на 30 проц. Сваечасова выконваць рашэньні, прыгавары і ўсю перапіску. Лепш абслугоўваць наведвальнікаў. Плянава праводзіць грамадзкую працу. Паляпшыць самаадукацыю.

Служачыя Віцебскага Акруговага Суду выклікаюць Вярхоўны Суд Беларусі на спаборніцтва па наступных пытаньнях: Больш хуткі разгляд касацыйных спраў. Лепшае інструктаваньне па касацыйных справах. Узмацненьне прапускной здольнасьці на 1 інстанцыі. Устанаўленьне цьвёрдага пляну працы выязных сэсій і рэвізій. Узмацненьне грамадз. працы.

* * *

Служачыя Віцебскай Натарыяльнай Канторы выклікаюць на спаборніцтва Гомельскую Натарыяльную Кантору па наступных пытаньнях: Пры выкананьні натарыяльных дзеяў, актыўна дапамагаць працоўным у абароне іх праў і законных інтарэсаў. Плянава рабіць абсьледваньне і інструктаваньне райёнаў акругі. Аб узмацненьні колькасьці натарыяльных дзеяў за год. Праводзіць плянава грамадзкую працу.

* * *

Судовыя выканаўцы Віцебскай акругі выклікаюць на спаборніцтва судовых выканаўцаў Гомельскай акругі па наступных пытаньнях: Выкананьне па спаўнцельным аркушам рабіць у дакладна устаноўленыя тэрміны. Узмацніць прапускную здольнасьць на кожнага судов. выканаўца. Плянава інструктаваць с-с.

* * *

Нарсьледчыя г. Віцебску выклікаюць на спаборніцтва сьледчых г. Гомелю па наступных пытаньнях: Павялічыць прапускную здольнасьць. Строга прытрымлівацца ўстаноўленых законам тэрмінаў знахаджэньня ў вытворчасьці спраў дазнаньняў. Палепшыць якасьць працы. Плянава рабіць абсьледваньне і інструктаваньне міліцыі. Плянава праводзіць грамадз. працу.

СЛУЦКАЕ АГЭНЦТВА ДЗЯРЖСТРАХУ ВЫКЛІКАЕ.

Слуцкае агэнцтва Дзяржстраху выступае ў сацыялістычнае спаборніцтва і выклікае на спаборніцтва Барысаўскае агэнцтва Дзяржстраху (Менскае акругі) і Жлобінскае агэнцтва Дзяржстраху (Бабруйскае акругі).

Спаборніцтва будзе праводзіцца па наступных галінах:

Разьвіцьцё звышакладнога і дабрахвотнага страхаваньня па ўсіх відах. Сваечасовае зьліквідаваньне страт па ўсіх відах. Зьнішчэньне цераніны і бюракратызму і спрашчэньне страхавое справы.

Па БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Батракоў--у вайсковыя школы.

ВОРША, 20-6 Ад батрацкай моладзі акругі ёсьць шмат заяў аб жаданьні паступіць у вайсковыя школы. Але адукацыя батракоў вельмі малая і акруговы Інспэктарыят асьветы парашыў арганізаваць каротнатэрміновыя курсы па падрыхтоўцы батракоў да паступленьня ў вайсковыя школы.

На правядзеньне гэтых курсаў, прэзыдыум акрвыканкому адпусьціў 500 рублёў.

Папулярызацыя пастаноў зьезду саветаў.

Ворша, 20-6. *З канца чэрвеня пачынаецца праца ў акрузе па папулярызацыі сярод рабочых і сялянства пастаноў Пятага Усесаюзнага, IX Усебеларускага і III акруговага Зьездаў Саветаў. На райвыканкомы, гарадзкія саветы, сельскія і местачковыя ўскладзен абавязак правесьці пленумы саветаў, на якіх і заслухаць даклады аб пастановах гэтых зьездаў. Таксама пастановы будуць прапрацоўвацца на сэкцыях і камісіях з удзелам уцягнутых у працу камісій рабочых, дэлегатак і сялян-беднякоў. На сходках рабочых і ў больш буйных вёсках пастановы зьездаў таксама будуць растлумачвацца праз спэцыяльна вылучаных дзеля гэтага таварышоў.*

Такім чынам, працоўныя Аршаншчыны будуць ведаць пастановы вышэйшых органаў свае ўлады.

Падрыхтоўка да асеньняй сяўбы.

Бабруйск, 20-6. Бабруйскі акруговы сельска-гаспадарчы банк вызначыў сваім плянам водпуск крэдыту на правядзеньне асеньняй пасеўкампаніі. Па пляну мяркуецца адпусьціць на набыцьцё рабочае жывёлы 55 тысяч рублёў, на набыцьцё сельска-гаспадарчых машын і прыладаў—192 тыс. р., на насеньне—48 тыс. руб. Апрача таго, на вапнаваньне глебы ў час асеньняй сяўбы вызначаецца водпуск сродкаў у суме 75 тысяч рублёў.

Усяго на правядзеньне асеньняе сяўбы мяркуецца адпусьціць 443.500 рублёў.

Двухтыднёвік пажарнай аховы.

Гомель, 20-6. З надыходам лета пажары ў сельскіх мясцовасьцях наносяць вялікія страты насельніцтву. У апошні час ва ўсіх райёнах акругі пажарамі зьнішча на шмат сялянскіх двароў і іншых будынкаў.

Распаўсюджаньне пажараў зьяўляецца ў выніку нездавальняючага стану пажарнай аховы на сяле. У многіх селішчах да гэтага часу не арганізаваны пажарныя каманды, а існуючыя бязьдзейнічаюць. З гэтай прычыны ў некаторых селішчах у якасьці ратаўнічага сродку насельніцтва выходзіць з абразамі на барацьбу з агнём, або спрабуюць заліць агонь малаком. Але гэтыя „выпрабаваныя сродкі" не дапамагаюць і хата за хатай гарыць, калі толькі дапамога ня прыдзе ад дысцыплінаванай пажарнай дружыны.

Пажарныя машыны ў большасьці селішчаў папсаваныя. Пажарны інвэнтар раскідан па дварох і ў патрэбны момант насельніцтва ня ведае, дзе ён знаходзіцца. Пажарныя шасты без жалеза і ня годны да ўжываньня. Многія сельсаветы скарысталі сумы па самаабкладаньню на набыцьцё пажарнага інвэнтару.

Зараз у акрузе намячаецца правесьці "двухтыднёвік пажарнай аховы". У працягу двухтыднёвіка будуць прыняты меры да ўзмацненьня існуючых пажарных каманд і да арганізацыі новых 50 каманд.

Барацьба са шкоднікамі.

БАБРУЙСК, 20-6. Бабруйшчына спачатку вясны шырока разгарнула працу па барацьбе са шкоднікамі садоў. Да сёньняшняга дню абозамі абслужана 522 сады з лікам у 81 тысячу дрэў. На акрузе працуе 7 абозаў па барацьбе са шкоднікамі садоў. Для яшчэ большага разгортваньня гэтай працы акрземадделл у хуткім часе адчыняе двое райённых курсаў для падрыхтоўкі спэцыялістаў па барацьбе са шкоднікамі. Курсы разьлічаны на 60 чал.

Чыстка савецкага апарату.

Полацак, 14-VI. Напярэдадні чысткі было праведзена шырокае растлумачэньне сярод працоўных гораду, адбылося шэраг сходаў па пытаньні аб чыстцы савецкага апарату і аб вылучэньні новых рабочых замест вычышчаных. Рабочыя актыўна дапамагаюць у выяўленьні варожых нам асоб. Чыстка пачалася з Біржы Поацы і калектываў.

Мерапрыёмствы да зьмяншэньня беспрацоўя.

Ворша, 19-6. На Аршанскай біржы працы ёсьць значная колькасьць некваліфікаваных беспрацоўных, якія яшчэ ня могуць быць скарыстаны на працы. Адначасова адчуваецца няхват кваліфікаваных рабочых: не хапае 432 каменшчыкі, 150 гарбароў, 125 арматуршчыкаў і інш.

Каб паменшыць беспрацоўе і мець больш кваліфікаванай рабочай сілы, акрвыканком і інспэкцыя працы запрапанавалі ўсім будаўнічым арганізацыям даць магчымасьць больш скарыстоўваць на іх будаўнічых работах некваліфікаваных беспрацоўных шляхам прымацаваньня іх да арцеляў кваліфікаваных рабочых. Гэтым самым некваліфікаваныя рабочыя атрымаюць магчымасьць дакваліфікавацца і, такім чынам, у будучыне будзе зьнішчан недахоп у кваліфікаванай працоўнай сіле.

Сярод некваліфікаваных беспрацоўных значную колькасьць складаюць беспрацоўныя жанчыны. Інспэкцыя працы прымае меры да скарыстаньня беспрацоўных жанчын на больш лёгкіх будаўнічых работах.

Дзеля памяншэньня беспрацоўя зьвернута асаблівая ўвага на разьвіцьцё працкалектываў. Перад Наркампрацы ставіцца пытаньне аб павялічэньні сродкаў на разьвіцьцё працкалектываў, што дасьць магчымасьць уцягваць у іх больш беспрацоўных. Таксама пастаўлена пытаньне аб павялічэньні сродкаў на арганізацыю грамадзкіх работ.

Гарсавету запрапанавана прыняць меры да цалепшаньня жыльлёвых умоў працкалектываў. Адначасова перад Наркампрацы ставіцца пытаньне аб водпуску сродкаў на пабудову новых памяшканьняў пад працкалектывы.

Дзеля павялічэньня кваліфікаванай працоўнай сілы на работах Асінбуду, Энэргабуду і Белдзяржбуду маюць быць арганізаваны быццам вучнёўства з беспрацоўнай моладзі.

Усім будаўнічым арганізацыям і розным прадпрыёмствам, установам і арганізацыям катэгарычна забаронена прымаць на работу бяз біржы працы.

Толькі ў некаторых выпадках, пры правядзеньні работ, у тых мясцовасьцях, дзе няма біржы альбо карэспандэнцкага пункту, дазваляецца набіраць рабочых праз сельсаветы і камітэты сялянскай узаемадапамогі. Зьвернута ўвага ўсіх прадпрыёмстваў і арганізацый на недапушчэньне на работу заможных, якія ў апошнія часы рознымі шляхамі прабіраюцца на сэзонную работу.

Біржы працы запрапанавана ў першую чаргу пасылаць на работу дэмабілізаваных чырвонаармейцаў, а таксама зьвярнуць асаблівую ўвагу на скарыстаньне вясковай і местачковай беднаты на мясцовых мэліярацыйных, тарфяных і дарожна-будаўнічых работах і на часовай летняй працы ў савгасах.

А. Калюжны.

Абраньне дэлегатаў на зьезд палякаў у Варшаве.

зьвязку з надыходзячым у Варшаве зьездам палякаў, якія жывуць за межамі Польшчы, у Віцебску адбыўся сход рабочых-палякаў фабрыкі «Дзьвіна», заводу „Мэдпрам", а таксама чыгуначнікаў. Сход у рэзалюцыі выказаўся за ўдзел у зьезьдзе дзеля таго, каб выкрыць пляны польскага фашызму і расказаць праўду аб дасягненьнях польскага працоўнага насельніцтва Беларусі.

Працоўныя палякі,— зазначана ў рэзалюцыі,—зрабілі ўсё, каб абараніць адзіную бацькаўшчыну сусьветнага пралетарыяту—СССР.

Сход абраў акруговы грамадзкі камітэт па правядзеньні выбараў. У склад камітэту абрана 5 асоб. Сярод іх адзін настаўнік, два рабочыя і адна работніца фабрыкі «Дзьвіна", а таксама рабочы-чыгуначнік.

Акруговая канфэрэнцыя акругі назначана на 30-га Для выбараў дэлегатаў на канфэрэнцыю ва ўсіх гарадо будуць праведзены сходы польскага насельніцтва.

* * *

Цэнтральны грамадзкі к правядзеньні выбараў атры дамленьні аб абраньні акру мадзкіх камітэтаў у гарадо і Воршы. У склад камітэтаў рабочыя і сяляне-палякі.

Цэнтральны грамадзкі к правядзеньні выбараў у БСС паведамленьні аб пачатку в акруговыя канфэрэнцыі амал ўсіх акругах сярод польска нага насельніцтва. Распачаў збор сродкаў на паездку дэ

Уся ўвага асеньняй пасеўнай кампаніі.

(Гутарка з Нар. Кам. Землярodства тав. Рачыцкі).

ПАСЕЎНАЯ ПЛОШЧА ПАШЫРЫЦЦА НА ПАЎТАРА ПРОЦ. АЧЫСЬЦІЦЬ 65 ПРОЦ. ПАСЕЎНАГА СЯЛЯНСКАГА НАСЕНЬНЯ СЫМАЛЬНАЯ ДАПАМОГА БЕДНАЦЕ.—ЦАЛКОМ ВЫКАРЫСТАЦ МЯСЦОВЫЯ МАГЧЫМАСЬЦІ ДЛЯ ПАЛЕПШАНЬНЯ ГЛЕБЫ І ЧЭНЬНЯ КОЛЬКАСЬЦІ ШТУЧНАГА ЎГНАЕНЬНЯ.

— Асеньняя пасеўная кампанія набывае вялікае палітычнае і эканамічнае значэньне, што было адзначана апошнімі пастановамі ЦК партыі і ўраду БССР.

Асноўнымі задачамі кампаніі павінна быць: **далейшае пашырэньне пасеўнай плошчы** за лік аблог, мэліараваных зямель і іншых зямель, якія да гэтага часу яшчэ не выкарыстоўваюцца, з такім разьлікам, каб у асеньнюю кампанію **пашырыць пасеўную плошчу на паўтара проц.**; максымальна садзейнічаць падняцьцю ўраджайнасьці.

За плянавую ачыстку насеньня.

Мы ў кожную пасеўную кампанію зьвяртаем асаблівую ўвагу на ачыстку насеньня. У гэту пасеўную кампанію трэба дабіцца таго, каб было ачышчана 65 проц. пасеўнага сялянскага матар'ялу, а ў савгасах і калгасах насеньне павінна быць ачышчана на ўсе 100 проц.

Працу па ачыстцы насеньня трэба паставіць на плянавыя рэйкі і бязупынна сачыць за рацыянальным і сваечасовым выкарыстоўваньнем збожжаачысных машын.

Шырэй агранамічныя веды.

У правядзеньні асеньняй пасеўнай кампаніі неабходна стаць на шлях шырокага ўнядрэньня ў сельскую гаспадарку агранамічных ведаў.

Вясковыя аграномы павінны аддаць максымум увагі пасеўнай кампаніі, разгрузіўшыся ад дробнай, малапатрэбнай працы. Мы абавязкова павінны дабіцца **падняцьця раньняга папару, сваечасовага абмалоту і засеву палёў.**

Акрамя падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы, аграномы павінны таксама рыхтавацца і да наступнай вясеньняй кампаніі, з такім разьлікам, каб ня менш 40 проц. усяго вясеньняга засеўнага кліну было ўзарана ўвосень.

400.000 гэктараў—на шматпольле.

Неабходна адзначыць, што тэмп пераходу на шматпольле значна адстае ад тэмпу земляўпарадкаваньня. У гэтым годзе нам неабходна дабіцца пераходу на шматпольны севазварот ня менш 400.000 гэктараў. Гэта справа патрабуе перагляду і пашырэньня норм нагрузкі на кожнага агранома да 1000 гэктараў для пераводу іх на шматполны севазварот.

Павялічым колькасьць штучнага ўгнаеньня.

Мы паставілі перад сабою задачу: завезьці з-за межаў БССР 39000 тон рознага штучнага ўгнаеньня. Але наша прамысловасьць і імпарт далёка ня змогуць задаволіць сельскую ку штучным угнаеньнем. В неабходна **ўжыць усе маг да выкарыстаньня м штучнага ўгнаеньня**—торф ны. Такім чынам, да асеньн ў БССР трэба набыць 75000 ны для ўгнаеньня 25000 г таксама неабходна здабыць 3 торфу на ўгнаеньне 5000 гэ

Як бачым, у нас ёсьць (рускае ўгнаеньне, якое цалк скарыстаць для палепшаньня падняцьця ўраджайнасьці.

Усё бядняцкае поле быць засеяна.

Дапамога вясковай веднаце кампаніі павінна ісьці, гало нам, па лініі крэдытаваньня сярэдняй дапамогі з боку к-т ской узаемадапамогі. Усе мяс ганізацыі павінны пайсьці беднаце, каб **усё бядняцк было засеяна.** Апрача да гавай сілай, дапамогі з боку і калгасаў, якія сваім інвэн памогуць сем'ям чырвона удовам і інш., трэба, каб к-т ской узаемадапамогі выявілі і ву і зьвярнулі асаблівую ўва вы від дапамогі беднаце, с апрацоўку беднатой сваёй зям

Узмацнім калгаснае ніцтва.

Разам з правядзеньнем ус чаных мерапрыёмстваў будзе дзіцца шырокая праца па д пашырэньні існуючых калгаса рэньні новых. Нам *трэба* а ўвагу зьвярнуць на ўзбуйнень ючых калгасаў за лік суседні ских гаспадарак.

30.000 гэктараў—пад на тацыю.

У часе асеньняй пасеўнай вызначана закантрактаваць 30 тараў. Пытаньню кантрактацы даем вялікае значэньне. Апрач га, маем на ўвазе засеяць 20 тараў гатунковым насеньнем гкт. жытам і 1000 гкт. азім цай.

За плянавасьць, гібк апарату, за грамадзк

Пасьпяховае правядзеньне пасеўнай кампаніі залежыць навасьці, гібкасьці зямельнага і ад тэй грамадзкасьці, якая б ганізавана вакол кампаніі.

Апрача гэтага, трэба на 10 выкарыстаць усе мясцовыя ма ці і сродкі; трэба скарыстаць кую ініцыятыву сялянства і га актыву, каб усю ўвагу на на добрае правядзеньне кампа

С. ІНГУЛАЎ.

ЯК ПРАХОДЗІЦЬ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА *).

(Папярэднія вынікі).

Уздым, выкліканы сацыялістычным спаборніцтвам у горадзе і распаўсюджаны ў шырокіх разьмерах на вёску, ахапіў таксама пласты гарадзкой і сельскай інтэлігенцыі.

Аранбурскія земляўпарадкавацелі ў парадку спаборніцтва ўзялі на сябе абавязацельства павысіць дадзеную ім плошчу для земляўпарадкаваньня ў два разы.

Працаўнікі асьветы Самары і Саратава, уступіўшы паміж сабой у спаборніцтва, узялі на сябе абавязацельства, апроч папулярызацыі лёзунгаў сацыялістычнага спаборніцтва ў прамысловасьці і ў сельскай гаспадарцы, дабіцца навучэньня пэўнай колькасьці запісьменных, практычнага правядзеньня агранамізацыі школ, павялічэньня і ўшчыльненьня навучальнага году, зьмяншэньня адсеву вучняў рабочага і сялянска-серадняцкага складу, зьмяншэньня другагодніцтва, устанаўленьня сапраўднай сувязі школы з індустрыяльнымі прадпрыёмствамі, калгасамі і савгасамі, прасоўваньня радыё ў масы, арганізацыі вячэрняй школы пры школе павышанага тыпу, адмаўленьня ад зьяткаваньня царкоўных сьвят і г. д.

У спаборніцтва ўступілі таксама студэнты вузаў, паставіўшыя сабе мэтай правільна арганізаваць практыку, рацыяналізаваць навучальнае жыцьцё, павысіць акадэмічную пасьпяваемасьць, дабіцца дысцыпліны ў школе, скарыстаць летнюю практыку для разьвіцьця калектывізацыі ў вёсцы і для ўзмацненьня прадукцыйнасьці працы на прадпрыёмствах.

У сацыялістычнае спаборніцтва ўцягваюцца і чырвонаармейскія часткі. Тут спаборніцтва разьвіваецца па лініі ўдасканаленьня ў стралковай справе, тактычнай падрыхтоўцы, узмацненьня палітыка-маральнага стану часьцей, узьняцьця дысцыпліны, палепшаньня палітычнага выхаваньня, палепшаньня матар'яльна-бытавых умоў і г. д.

Увайшла ў спаборніцтва і спажывецкая каапэрацыя. Ленінградзкі каапэрацыйны актыў уступіў у спаборніцтва з маскоўскім на зьніжэньне накладных выдаткаў, на патаньне і спрашчэньне тавараправодзячай сеткі, на рацыяналізацыю апарату і г. д.

Спаборніцтва паступова прымушае перабудоўвацца на адпаведны лад і культурныя ўстановы, якія непасрэдна абслугоўваюць рабочую масу і зьвязаны з вытворчым жыцьцём рабочых.

Клюбы, напрыклад, паступова становяцца арэнай узьдзейнічаньня на адсталыя рабочыя масы і перавыхаваньня іх у духу тых задач, якія стаяць перад пралетарскай дзяржавай.

Аб'ектам найбольшай увагі ў клюбе за апошнія месяцы стаў прагульшчык. Напрыклад, на Галавінаўцы, Кадыеўскага рудакіраўніцтва, Луганскай акругі, быў арганізаваны сямейны вечар. Пасьля прэміраваньня лепшых рабочых былі агалошаны чорныя сьпісы прагульшчыкаў. Як паведамляюць „Известия", эфект быў надзвычайна моцны. Жонкі, якіх „зганьбавалі" муж'яломыры, так задалі ім тут-жа на вечары, так адчыталі іх з эстрады, што яны „ня ведалі, куды дзецца ад сораму».

Не пераналічка, а спаборніцтва.

Усе пералічаныя тут прыклады сьведчаць аб тым, што сацыялістычнае спаборніцтва, як ніколі, раскачала працоўныя масы і пасьлядоўна ўзьнімае іх сьвядомасьць на ўзровень сапраўдных будаўнікоў сацыялістычнай дзяржавы. Спаборніцтва абнажае дасканалыя вынікі, калі, аднак, у арганізацыі яго ня будуць дапушчаны памылкі.

Больш усяго трэба баяцца магчымасьці перараджэньня спаборніцтва ў „пераклічку-монстр", у парадны перазвон верхавінных арганізацый, які не забясьпечвае сапраўднага ўдзелу ў спаборніцтве шырокіх мас рабочых.

Найбольшых вынікаў можна спадзявацца ня там, дзе спаборніцтва пачынаецца зьверху, дзе яно дэкляруецца шматабяцаючымі і напышлівымі зваротамі абласных, краёвых, рэспубліканскіх і нават акруговых арганізацый, а там, дзе ініцыятыва расьце зьнізу, дзе ўдарная брыгада камсамольцаў перарастае ў ударны цэх, які, у сваю чаргу, заражае сваім энтузіязмам суседнія цэхі, дзе ад варштата да варштата, ад групы да групы перадаецца падахвочваючы энтузіязм мас.

З гэтага пункту погляду найменшай карысьці можна чакаць ад дагавору, утворанага паміж Сярэдня-Волскім абласным і Ніжня-Волскім краёвым выканкомам. Ня гледзячы на тое, што ў гэтых дагаворах усё на першы погляд сурова разьлічана і вылічана, ня гледзячы на тое, што гэты дагавор, туга набіты лічбамі, каэфіцыэнтамі, індэксамі і процантамі, робіць уражаньне добра прадуманага, ён усё-ж зьяўляецца дагаворам органаў улады, а не дагаворам шырокіх мас.

Пры ўступленьні ў спаборніцтва і пры заключэньні дагавораў неабходна вельмі строга кіравацца пастановаю ЦК партыі, якая падкрэсьлівае, што **«рашаючаю ўмоваю дасягненьня гэтых задач (канкрэтных задач спаборніцтва) і рэальных гаспадарчых вынікаў спаборніцтва зьяўляецца сьвядомасьць і непасрэдны ўдзел рабочых мас, а таксама самы актыўны ўдзел спэцыялістаў у спаборніцтве на прадпрыёмстве, у цэху, у майстэрні.** Для гэтага ўсе выклікі і рашэньні аб удзеле і спаборніцтве павінны абавязкова праходзіць праз агульныя сходы цэху і прадпрыёмства. Асабліва важна ініцыятыва саміх рабочых у справе арганізацыі разьвіцьця і замацаваньня спаборніцтва". Гэта правільна ў адпалькавай меры і ў адносінах савгасаў, калгасаў, зямельных таварыстваў, культурных установ, чырвонаармейскіх часьцей і ўсіх арганізацый, установ і прадпрыёмстваў.

Самым буйным злачынствам было-б апаганіць ідэю сацыялістычнага спаборніцтва бюракратычным падменам творчай ініцыятывы мас афіцыйнымі, самаздаволенымі дэклярацыйнымі выступленьнямі верхавінных органаў. Не захапляцца адозвамі паказнымі эфэктамі і напышлівай агітацыйнай шуміхай—першая і асноўная ўмова сапраўднага посьпеху спаборніцтва.

Рабочыя тульскіх гігантаў заводаў ня ведаюць аб тым, што яны ўступілі ў спаборніцтва і падпісалі аб гэтым дагавор, даведаліся толькі з газэт. Нават пасьля падпісаньня дагавору рабочых не паведамілі ні на агульным сходзе, ні на цэхавым сходзе, што яны знаходзяца ў спаборніцтве з іншымі мэталёвымі прадпрыёмствамі.

Такое зьявішча магчыма толькі там, дзе аддаецца належнае толькі модзе, дзе мітынгоўшчына і дэклярацыйная бутафорыя выціскаюць жывое жыцьцё.

Ад таго, якім будзе кіраўніцтва прафсаюзаў, ад таго, наколькі хутка пізавыя прафарганізацыі здолеюць перабудавацца і прыстасавацца да тэмпу гэтага нарастаючага руху, залежыць і посьпех спаборніцтва.

За вынікі!

Ад сьвяточных звонаў і агітацыйнай сумятні трэба перайсьці да дзейнага штодзённага кіраваньня спаборніцтвам. Фабкомы і завкомы павінны стаць на чале спаборніцтва, канкрэтызуючы супольна з гаспадарнікамі, вытворчымі камісіямі і нарадамі заданьні для кожнага цэху, для кожнай групы, для кожнага варштату.

У гэтых адносінах дасканалым узорам правільнай арганізацыі справы ўжо з першых крокаў спаборніцтва паказаў „Красный Выборжец". Ён здолеў вызначаны па вытворчым пляну процант зьніжэньня сабекошту дыфэрэнцыраваць для кожнага цэху і перавесьці яго на канкрэтныя лічбы эканомікі, якой неабходна дабіцца кожнаму цэху паасобна, кожнаму рабочаму ў працягу году.

Добра, што друк зараз пачынае ўсё з большаю настойлівасьцю патрабаваць выкінаў спаборніцтва. Добра, што ў парадку самакрытыкі ўсё часьцей зьяўляюцца зараз артыкулы і заметкі пад загалоўкам—«Шуму многа—карысьці мала». Неабходна, каб надмерна руплівыя «агітатары», завкомы і ячэйкі, якія захапляюцца прамовамі, плякатамі, мітынгамі, дагаворамі, дэкларацыямі, як мага хутчэй перашлі да практычнай штодзённай барацьбы за рэальныя вынікі спаборніцтва. І добра, што зараз многія газэты ўжо бяруць пад кантроль выкананьне абавязацельстваў, даданых паасобнымі прадпрыёмствамі ў парадку дагавораў. Асабліва настойлівымі і энэргічнымі павінны быць у гэтай справе нізавыя органы друку: фабрычна-заводзкія друкаваныя і насьценныя газэты.

Нельга не змагацца з усім тым, што можа сказіць, вульгарызаваць ленінскую ідэю сацыялістычнага спаборніцтва і хоць у якой-небудзь меры затрымаць нябачаны творчы імпэт шырокіх мас. Адначасова з гэтым мы павінны вельмі любоўна і асьцярожна адносіцца да пачын

НА ЧОРНУЮ ДОШКУ

гультайства, бязладзьдзе, бюракратызм, галавацяпства.

Іван Міроныч—добры дыплёмат.

(Коханаўскі райён, Аршанскай акругі).

Коханаўскім райёне маецца лесазавод ва, эксплёатуемы Азерацкім лясным быствам.

Гадчык заводу Алфярэнка Іван абвя- сялянству, што за прывоз аднаго драўніны будзе выдаваць: па 3 клгр. і 1 клгр. пшанічнай мукі. Сялян- паваліла з усіх бакоў валам.

Ны выпадак лесазавод скарыстаў поў- ацю, але сялянства надуў.

Сяляне хут. Любатынь, Рэчак і інш. вё- зілі лес на лесазавод, і дошкі на Коханава, а калі зьвярнуліся вясной Івана Міроныча за аўсом і пшаніч- дык ён адказаў—пішы прапала, а на таньне, калі дасьцё грошы,—атрыма- каз „заўтра", бо „заўтракамі" Іван навіч мастак карміць.

Аз некальі дзён сяляне (а ім да Ра- і назад звыш 20 кілёмэтраў) зноў нуліся да Івана Міроныча за грашы- атрабуя іх, а Іван Міроныч заявіў: гроны патрэбны планіць за лес. пачакаеце... да заўтра".

Калі сяляне ўжо шосты раз прышлі да Міроныча, апошні выдумаў новы „трюк": „выдам грошы па некаторым талёнам, але тым, хто зараз здвязе па возу ў Коханава і прад'явіць талёны аб адвозцы"...

Сяляне прымушаны былі згадзіцца, вярнуліся ў двор, запраглі ксні і прыехаўшы ў Рацава павезьлі „определенной укладки" Івана Міроныча вазы на ст. „Коханава".

На другі дзень зноў сяляне пайшлі за грашыма, а Міроныч кажа ім „прыдзеце 20-IV". Прышло „20" красавіка, сёмы раз прышлі сяляне, Іван Міроныч ня дурны чалавек—ён выехаў з заводу і сяляне грошай не атрымалі.

Пазьней, Іван Міроныч сялянам заявіў: „Калі ў суд падасьце, аусім не аддам, а калі паскардзіцеся, дык праз 6 месяцаў аддам"... і словы свае праводзіць у жыцьцё. Так сяляне і ня могуць дачакацца грошай.

Незнаёмы.

Чаму ня судзяць прасьледвацеляў селькора Віленчыка?

Усё тое, што ёсьць дрэннага ў нашым савецкім апараце можна было знайсьці ў працы Вульскага райвыканкому, Полацкай акругі. Вось некаторыя прыклады.

Кулак мяст. Вулы Сідлер, які мае 2-х батракоў, 4-х кароў, 2 коняй у мінулым годзе атрымаў з мясцовага крэдытнага таварыства 100 руб. доўгатэрміновага крэдыту. Такім чынам нават у нізавых каапэрацыях кулацкая частка насельніцтва магла з посьпехам узмацняць сваю гаспадарку, а беднякі былі ў загоне.

Пры правядзеньні будаўніцтва ў раёне ў 1927-28 г. кожны з адказных працаўнікоў імкнуўся зьберагчы для сваёй кішэні грамадзкія сродкі. Першы з іх былы старшыня райвыканкому Баразна паклаў сабе ў кішэню некалькі сотняў рублёў. Не адставалі ад Баразны і іншыя працаўнікі. Вось чаму пабудаваны нардом у мяст. Вула, які каштаваў 5.000 руб. зараз разваліўся. Справа абыйшлася без пакаранья для „будаўнікоў".

Касір Вульскага Крэдытнага Таварыства Антонаў Сяргей растраціў у лістападзе месяцы 1928 г. каля 700 руб. каапэрацыйных грошай. Здавалася-б, што пасьля выяўленьня растраты справа павінна перадацца ў суд. Але вульскія адміністратары зрабілі наздваро т. Парапылі ўсе, як адзін, не даводзіць справу Антонава да суда і сабрась грошы.

Камісія прышла і да мясцовага сьледчага актыўнага селькора т. Віленчыка, каб атрымаць ад яго „аброк" у суме 15 руб. для пакрыцьця растрат Антонава. Тут—усё і пачалося. Сьледчы, селькор т. Віленчык быў абураны такім агідным фактам „самапакрыцьця" злачынцаў, і тутжа зараз распачаў крымінальную справу па абвінавачаньню Антонава і міліцыянэраў Гладыша, Новіка, якія зьбілі грамадзянак Гольдзіну і Барысевіч Марыю.

У процівагу гэтаму склікаецца тэрміновае пасяджэньне (пры зачыненых дзьвярох) райвыканкому, дзе ставіцца ва ўсю шырыню пытаньне аб „паводзінах сьледчага Віленчыка". Усе выступаюць з вялікімі прамовамі. Старшыня Райвыканкому Будзько называе Віленчыка „сопляком", „бузотером-трепачом" начальнік раймілыцыі Міцкевіч дае селькору Віленчыку імя „здрадніка справе рабочай клясы", загадчык камгасам дайшоў да таго, што назваў т. Віленчыка „нэрвова хворым". Бралі з іх прыклад і старшыня райкрэсткому Грэчкін, разам з апоргам райкому партыі Ліпоўскім.

У абарону т. Віленчыка выступіў інспэктар Нарасьветы камуніст, селькор т. Пчолкаў які праз нязначны час быў зьняты з працы пад відам „нягодласьці", у той час як ён зьяўляецца добрым пэдагогам і грамадзкім працаўніком. Была ўхвалена пастанова, у якой гаварылася: „Сьледчага Віленчыка зьняць з працы за скажэньне клясавай лініі". Вось як зрабіла адміністрацыя Вульскага раёну. Сьледчы селькор Віленчык ня маючы належнай дапамогі ад акруговых органаў павінен быў выехаць з Вулы, ня спыняючы весьці рашучую барацьбу з агіднымі зьявішчамі.

На дапамогу т. Віленчыку прышоў толькі адзін акруговы пракурор т. Валкінштэйн, заставіўшы яго на гэтай-жа працы ў горадзе.

У сучасны момант т. Віленчыка ў Вуле ўжо няма. Ён працуе сьледчым у г. Полацку, ня спыняючы весьці шырокую селькораўскаю працу. Прасьледвацелі Віленчыка на сваіх мясцох, а некаторыя нават атрымалі падвышэньне па службе.

Справа Віленчыка дайшла да ЦКК КП(б)Б, Член прэзыдыума ЦКК КП(б)Б т. Вінаградаў, які наведаў г. Полацак, на нарадзе актыву РСІ 29 красавіка г. г. паведаміў, што у „Вульскім райёне ўжываліся агідныя факты, за выкрываньне якіх сьледчы, селькор т. Віленчык, прасьледваўся". Там-жа т. Вінаградаў дадаў, што „ЦКК КП(б)Б дала дырэктывы Полацкім органам аб тым, каб прасьледвацеляў Віленчыка аддаць пад суд".

Прайшло ўжо шмат часу. Аб справе Віленчыка некаторыя палачане пачалі забываць. Нас цікавіць зараз толькі адно: чаму ня судзяць прасьледвацеляў селькора?

Андрэй Дудка.

Прыклад валакіты.

Былы настаўнік Жардзяжскае школы Плешчаніцкага райёну, Менскай акругі Чачык Аляксандр нарабіў страт Жардзяжскай школе і злоўчынкаў насельніцтву. Заявы і адносіны аб спагнаньні з яго страт ляжаць па некальі месяцаў, як напрыклад, адносіна Плешчаніцкага РАНА ў Бягомльскі Нар. Суд паслана 24 сакавіка 1928 г., а атрымана ў Нар. Судзе 30 траўня 1928 г.

Але прасачым па парадку ход справы. 20 лістапада 1927 г. пададзена заява ў Плешчаніцкі РАНА аб самаўпраўным захваце школьнай зямлі Жардзяжскае школы і ўраджаю з яе настаўнікам Бягомльскага райёну Аляксандрам Чачыкам.

12 сьнежня 1927 г. гэтая заява адаслана Плешчаніцкім РВК у Бягомльскі Нар. Суд для разгляду.

24 сакавіка 1928 г. Плешчаніцкае РАНА паведаміў Бегомльскі Нар. Суд, што па гэтай справе настаўнік Голуб зьяўляецца прадстаўніком Райінспэктуры, бо часьць прыбыткаў ад школьнай зямлі ідзе на школу, а часьць у карысьць настаўніка, які працуе ў данай школе.

30 мая 1928 г. Бягомльскі Нар. Суд зварочвае ўсю перапіску без разгляду ў Плешчаніцкі РАНА.

31 ліпеня 1928 г. Плешчаніцкі РАНА перасылае зноў у Бягомльскі Нар. Суд перапіску з просьбай аб разглядзе справы.

Бягомльскі Нар. Суд назначае на 14 сьнежня 1928 г. судовы разгляд справы.

Але яшчэ і да апошняга часу суд не адбыўся.

Вока.

Сімі дакладчыкі і самі аўдыторыя

(Полаччына).

Та было ў канцы студзеня мінулага Тры камуністы Палатоўскай ячэйкі сярод якіх сакратар ячэйкі Скрып- накіраваліся ў пункт Барсучына правядзеньня сходу бедноты па са- кладаньню.

Сход зьявілася чалавек 6-7 бедня- дзесятак сераднякоў. Гаварылі спа- аб перавыбарах сельсавету, а ня пра самаабкладаньне.

Тыўнасьць па сходзе была такая, м-жа самім прышлося рабіць да- восьць прапановы.

Старшынствуваў на гэтым сходзе ты—моцны серадняк, у хаце якога одзіўся сход. У выніку ўсіх разга- з боку серадняцкай часткі пасту- прапанова самаабкладаньня ня пры- бо грошы мінулага году невядома дзеліся.

Ды ячэйковыя кіраўнікі, спахваціў- ў „неубедительности" сваіх слоў, ылі разсадзіць сход:—беднякоў у 7 чалавек асобна, а сераднякоў у дзесятка асобна. Зрабіўшы гэта, сталі ўносіць прапановы і патрэба- галасаваньня беднатой іх прапаноў, ым адзін уносіў адно, другі дру- Пачалі галасаваць. Прапанова за са- кладаньне правальваецца, бо за яе ўюць толькі прадстаўнікі Палатоў- скай ячэйкі, якія не пасароміліся заявіць свае правы на ўдзел у галасаваньні.

Са сходу разыходзіліся сумныя. Сяляне беднякі думалі „і чорт-жа прынёс такіх дурняў праводзіць бядняцкі сход, дзе запраўляў гэнцыю беднякамі моцны серадняк, куды замест беднаты сабраліся досьць моцныя хутаране".

Але не сумавалі прадстаўнікі Палатоўскай ячэйкі Няфедаў, Скрыпка і Кулак. „Справа паправімая, думалі яны, ідучы дамоў" і сапраўды справа аказалася вельмі лёгка паправімай. Дома яны ўсё-ж сваю пастанову „правялі",—справіўшы падпісаны пратакол,—„што Барсучынскі сход беднаты прыняў самаабкладаньне на 25 проц.".

Сапраўдны пратакол папаў у вучот і з сялян патрэбавалі грошы.

Адгэтуль пашлі скаргі і нараканьні. Кіраўнікі ячэйкі больш туды не паказваюцца, бо сапраўды брыдка ім паказаць свае вочы.

Факт застаўся фактам, пагаварылі, заплацілі, а палатоўскія кіраўнікі па гэты дзень здаволены сваёй „дагадлівасьцю„ ў пасьпяховым правядзеньні самаабкладаньня.

Так галавацяпы праводзяць працу сярод беднаты.

К-оні.

Рэкордныя лічбы „вытворчасьці працы" гультаёў.

Вялізарнейшы энтузіязм выклікала сацыялістычнае спаборніцтва сярод рабочай клясы і сярод часткі працоўных наогул за сацыялістычную арганізацыю працы, за працоўную дысцыпліну, за ўздым вытворчасьці, за колькасьць і якасьць выпушчаемай прадукцыі. На фоне рэвалюцыйна-вытворчага гэраізму значна большай часткі рабочай клясы мы сустракаемся з лодырніцтвам, распуцтвам, нядбайнасьцю, п'янствам сярод паасобных адзінак ці груп працоўных. Насіцелі гэтага зла зьяўляюцца паразітамі на целе працоўных, якія сваёю адданасьцю справе сацыялістычнага будаўніцтва вядуць упартае змаганьне за ўздым народнай гаспадаркі.

Мы прадэманструем тут такія факты, якія магчыма не сустракаліся яшчэ ня толькі ў БССР, але і ў СССР,—гэта факты агіднейшых адносін да працы. Вось савгас „Дарашэвічы", Мазырскай акругі, як скарыстоўвае рабочую сілу. Два прыклады толькі: 19 кастрычніка 28 г. на выкапцы бульбы працавала 2 мужчыны, 96 жанчын, пры 4 конях і 6 валох пры чым выкапалі за цэлы дзень 2.400 кілёграм, альбо па 25 кілёгр. на кожную рабочую адзінку, 20 кастрычніка працавала 2 мужч., 78 жан. пры 4 конях і 6 валох і выкапалі 2880 кілёграм, ці па 37 кілёгр. на рабочую адзінку. Гэта „рэкордныя" лічбы такой „вытворчасьці працы" наэўна нідзе нямa ні ў адным савгасе. Аб гэтай працы гультаёў савгасу Дарашэвічы павінны ведаць усе працоўныя нашай рэспублікі, каб закляйміць ганьбаю такія ўчынкі.

Трэба дадаць, што кіраваў працамі на полі рабочы Пасюк, член партыі, кіраваў так: людзі сядзелі каля вогнішчаў і пяклі бульбу, а калі хтось заўважыў, што так рабіць нельга, дык Пасюк (правільней было-б Пацук—шкоднік) адказаў: „ладна, нам няма куды сьпяшацца, грошы ўсё роўна атрымаем". Паведамляем Мазырскую АКК РСІ, што Пасюк працуе зараз на пасадзе старшыні рабачкому на лесараспрацоўках на вузкакалейнай ст. Пліч. Па нашай думцы да Пасюка трэба ўжыць такія меры ўзьдзейнічаньня, якія ўжываюцца наогул да шкоднікаў.

У гэтым савгасе наогул сабраліся лодыры, бесгаспадарнікі; вось прозьвішчы іх: Донскі, член партыі, Бэн, кіраўнік савгасу, гэта асобы накшталт Пасюка, ёсьць і сярод рабочых Пасюкі, Бэны, Донскія—гэта лодары, паразыты на целе савецкай гаспадаркі. Каб ня былі прыняты адпаведныя меры да аздараўленьня савгасу Дарашэвічы, то яго гультаі і шкоднікі разбурылі-б канчаткова.

Трэба тут-жа адзначыць, што амаль такое скарыстаньне рабочай сілы сустракаецца ў савгасах Камаровічы, Канстанцінава, Лучыцкі і Слаба да. Чым тлумачацца такія агіднейшыя факты?

Зусім проста, тым, што ні інспэктура трэсту, ні сам трэст, ні кіраўнікі савгасаў, ні прафсаюзныя органы, ні мясцовыя савецкія органы і грамадзкія арганізацыі ня цікавіліся гэтым пытаньнем, не кіравалі вытворчымі нарадамі і ў выніку ўсесаюзны „рэкорд вытворчасьці працы", агіднейшае скарыстаньне рабочай сілы.

Сапраўды, колькі было дырэктыў, пастаноў партыйных органаў і ўраду аб вясеньняй пасяўной кампаніі. Колькі гаварылі, пісалі аб тым, што ўздым ураджайнасьці, належная падрыхтоўка і правядзеньне вясеньняй сяўбы зьяўляюцца актуальнейшымі задачамі сёньняшняга дня. А як праміліся гэтыя дырэктывы ў савгасах Мазыршчыны? Дырэктывы ЦП Саюзу Рабземлес і Белсельтрэсту аб кантрольных лічбах на ўздыму ўраджайнасьці і аграмінімуме абгаварваліся толькі ў 2 савгасах, а ў астатніх ніхто з рабочых, альбо ня ведаў, альбо пагаварылі „вабчэ". Вось у савгасе Слабада на вытворчай нарадзе слухалі кіраўніка аб пасеўкампаніі, а пастановы ніякай ня вынесьлі, тое самае і ў савгасе Канстанцінава. У савгасе Дарашэвічы ўхвалілі такую пастанову: слухалі: Аб цягавай сіле. Ухвалілі: з цягавай сілай згадзіцца. Такіх пастаноў за адно пасяджэньне вынесена 9 з удзелам 20 чалавек прысутнічаўшых.

Мы тут ня зьбіраемся крыўдзіць няпісьменных рабочых, а пытаемся: дзе былі і што рабілі бухгальтары, рахункаводы, кіраўнікі—народ пісьменны, каб дапамагчы рабочым растлумачыць і напісаць пастановы? Што рабіла акруговае працоўнае саюзу з сваімі візавымі прафорганамі, каб дапамагчы рабочым паладзіць працу вытворчых нарад? Чаму не пацікавілася становішчам у савгасах мясцовая партыйная арганізацыя і РВК? Вось комплекс пытаньняў, якія паўстаюць пры аналізе безгаспадарчасьці, нядбайнайсьці, няўменьню працаваць у савгасах Мазыршчыны.

Мы гэтыя пытаньні ставім пералічаным установам і арганізацыям і просім РСІ зрабіць адпаведныя вывады. Прапусьціць без пакараньня нядбайнасьць, гультайства, шкодніцтва нельга, трэба па гэтым балячкам моцна біць, каб яны ў далейшым не паўтаралісь.

Сапраўды, Мазырскае акр. аддзяленьне саюзу ведала, што ў калектыве савгасу загніваньне, п'янства, распуста. Чаму яно не прыняло належных мер? Чаму ў Капаткевіцкім і Калінкавіцкім райёнах „працуюць" інструктары прафсаюзу, якія зусім нічога ня робяць? Чаму іх да апошняга часу ня зьнялі з працы? За гэта павінна адказваць акраддзяленьне саюзу, як і ўсе арганізацыі і ўстановы, якія маюць дачыненьне да савгасаў.

Мы яшчэ раз падкрэсьліваем, што вінаватыя павінны быць пакараны, аб агідных фактах у мазырскіх савгасах павінна ведаць уся савецкая грамадзкасьць, а чэсныя рабочыя савгасаў у далейшым павінны пастарацца чым хутчэй выправіць недахопы ў працы савгасаў. Гэтага патрабуе наша сацыялістычнае будаўніцтва, ад гэтага залежыць палепшаньне дабрабыту саміх рабочых, гэта неабходна для зьніжэньня сабекошту прадукцыі, якая дзякуючы безгаспадарчасьці па савгасах Мазыршчыны вышэй конвэнцыйных цэн.

Ів. Мацкевіч.

„Шчасьлівага вам падарожжа на службу Савецкай Краіне".

Выпуск студэнтаў з Полацкага Лестэхнікуму ў гэтым годзе прайшоў з вялікім уздымам. Адбылося спэцыяльнае ўрачыстае пасяджэньне, на якім прысутнічалі прадстаўнікі ад розных грамадзкіх арганізацый.

Дырэктар тэхнікума тав. Гранкоўскі выступаў перад перапоўненай аудыторыяй са спэцыялянай прамовай, у якой між іншым адзначыў наступнае:

— Таварышы, студэнты! Вы сёньня пакідаеце шумны Полацак заўтра ўяжджаеце у зялёны лес. Там вы будзеце выяўляць сваю здольнасьць, там для вас штодзённая праца. Вы сёньня пакідаеце нас... ва ваша месца ўвосень з гарадоў і далёкіх вёсак прыдуць дзеці працоўных. Дык пажадаю-ж вам шчасьлівага падарожжа ў лес, на службу індустрыялізацыі савецкай краіны...

Па залі разьнясьліся гучныя, перахадзячыя ў авацыю, воплескі. Заля дрыжэла. Ад імя студэнтаў выпускнікоў у адказ на прывітаньне выступіў адзін таварыш, які таксама адзначыў прыблізна наступнае.

— Мы загартованы выключна для барацьбы і перамог! Мы будзем сьмела ісьці па сацыялістычнаму шляху, які вызначан нябошчыкам...

Прамоўцу астанавілі гучныя воплескі. Заля яшчэ дрыжэла... Усе былі здаволены тым, што 55 таварышоў едуць на працу... Вечар скончыўся. Разыходзіліся з надзвычайна добрым настроем. Але гэта між іншым, уступ да канкрэтнага. Справа вось у чым.

15 мая 1929 г. Полацкі акруговы зямельны аддзел зялічыў па пасады памоцнікаў лясьнічых, згодна пададзеных заяў 2-х студэнтаў, скончыўшых у гэтым годзе Полацкі лестэхнікум, тав. Бауфман і тав. Мяшкова, якім пры гэтым былі выдадзены і грошы ў лік пэнсіі.

Праз некалькі дзён Бауфман з Полацкі акрэа прыслаў заяву наступнага зьместу: „Даваджу да ведама, што працаваць у Сьвядзкім лясьніцтве ня буду, бо там няма добрай кватэры. Узятыя грошы ў Акрэа будуць зьвернуты цераз месяц, а ў наступны момант на маю іх, бо я іх скарыстаў".

А вось заява Мяшкова ў акрэа: „Даваджу да ведама, што працаваць я ў В.-Далецкім лясьніцтве ня буду, бо прыехаўшы на месца працы, я убачыў зусім другія ўмовы, чым былі сказаны, як-та: лесанарыхтоўкі не вядуцца, надзелу няма. Узятыя мною грошы будуць зьвернуты праз месяц. Лічу, што калі застацца на працы не хаця, то праца будзе ня прадукцыйнай".

Мы з свайго боку да вышэйпамянёных заяў нічога ня можам даць. Скажам толькі, што дарэмна тав. Гранкоўскі жадаў ім шчасьлівага падарожжа ў лес, на службу індустрыялізацыі савецкай краіны.

Сьцяп. Міхальцоў.

Называецца закантрактавалі...

(Шклоўскі р., Магілеўшчына).

Ы Шклоўскім РВК працуе агранам эвіч, якому даручана справа на лагадоўлі. На працягу ўсёй сваей ён мае цесную сувязь з кулацкімі энтамі.

Мінулым годзе патрэбна было вы- ніць 20 бычкоў, ён аддаў іх на га- о вядомаму ў Шклоўскім райёне у, за што, вядома, планіў добрыя ы.

Ы арганізацыі малочных арцеляў эвіч даручаў і кулацкі элемэнт у а, за што яму ўжо вымову вынесьлі. пачатку гэтай вясны патрэбна было эвічу выявіць, хто хоча і колькі ктаваць сьвіней, каб ведаць каму грошы. Янушэвіч гэтага не зра- біў і калі прыходзяць невядомыя да яго сяляне, ён ім дае спраўку, што ў іх ёсьць сьвінькі, нават і ўзрост піша і пасылае іх у Госторгбел да Іваноўскага, каб выдаў грошы. Іваноўскі спраўку паглядзіць і выдае.

Так цягнулася доўга.

Нарэшце агледзеліся, каму-ж яны даюць грошы, але ўжо было позна. Высьветлілася, што людзей, якім выдадзены грошы, няма ў Шклоўскім райёне, а між тым выдалі 700 р. Апомніўся Янушэвіч піша запіску Іваноўскаму: „Пытайся насьведчаньне ў тых, хто кантрактуе сьвіней і з якога с-с." А Іваноўскі яму назад піша: „У далейшым я буду так практыкаваць".

Хр.

„Абяцанка-цацанка"

(Рагачэўскі р-н, Бабр. акр.).

выкананьне юбілейнай сэсіі ЦВК Рагачэўскі Райвыканком год з ім таму назад прыслаў у вёску рушнаўка паперку такога зьместу: дзнаку 10-годзьдзя Кастрычнікаў- рэвалюцыі і ў выкананьне на- ў сэсіі саюзнага ўраду, ся сялянству рушнаўскага сельсавету, якое вае патрабу ў сенажаці, адпушча- з запаснага фонду 71 дзес. сена- . А далей дасьцца тлумачэньне як меркаваць сенажаці і г. д.

ы сьпіша сялянству, а галоўнае савету: колькі клопату было каб меркаваць «падарунак».

Цэлую зіму сельсавет праводзіў пасяджэньні, пленумы, сходы сялян, сходы беднаты, актыву і г. д., каб як найлепей разьмеркаваць сенажаць і задаволіць запатрабаваньні беднякоў. Уся прана была скончана к лету 1928 году, ня гледзячы на тое, што ўсё насельніцтва хацела атрымаць падарунак Кастрычніка.

Калі-ж прышоў час касьбы, дык Райземчастка па чале з Лагутковым выдала другую пастанову аб гэтай сенажаці: перадаць яе Ціхініцкаму с.-с. Вось як працуюць нашы іншы раз установы.

Я. К.

Душаць самакрытыку.

(Гута „Ільліч"—Магілеўшчына).

З самакрытыкай на „Ільлічы" дрэнна. Партсходы беспартыйная рабочая маса амаль зусім не наведвае і самыя сходы ўсё больш зачыненыя бываюць. Рабочыя кажуць: — Што тыя сходы наведваць? Пагаворацъ, пагаворацъ, а тады: „выходзьце, беспартыйныя, бо далей будуць разглядацца сакрэтныя пытаньні".

На адным з апошніх сходаў, напрыклад, некаторыя члены ячэйкі гаварылі аб недахватах у працы бюро калектыву. Мала ўвагі зьвяртаецца, казалі яны, на жыльлёвае будаўніцтва... У заводакіраўніцтве—безгаспадарчасьць. Бігуны для ломкі сыравіны ўжо год цэлы будуюцца, а мажліва было-б пабудаваць іх за які небудзь месяц. Затрацілі на гэтую справу 2000 рублёў... Зацягнулі таксама і з рамонтам ваннай печы, і з набыцьцём машыны па выпрацоўцы торпу на апал.

Сэкратар парткалектыву Данько замест таго, каб растлумачыць у чым справа, абгаварыць—абазваў выступаўшых на сходзе трацкістымі. Ведаючы пра гэта, беспартыйныя рабочыя гаворацъ: Калі Данько партыйцаў гэтак за самакрытыку крые, дык нам лепей і не патыкацца.

У сувязі з такім „кіраўніцтвам" сэкратара, баяцца выступаць з крытыкай і партыйныя таварышы. Словам самакрытыкі няма.

Юр.

Пра „бацю" Міколу.

— Баця Мікола, я не магу вам даць паўлітра. калі не хапае грошай,—прагаварыў ужо чацьверты раз крамнік Станькаўскаму папу.

— Ды я вам пасьля даплачу, а цяпер адпусьціце,—бог вам за гэта падзякуе,—маліў, прасіў баця.

— Ну і нахальны поп,—падумаў сабе крамнік і згадзіўся даць паўлітра бацю ў доўг.

Ухапіўшы паўлітра,—баця пасьпешна вышаў з крамы.

Не дайшоў да дому баця, ня вытрымаў і прытуліўшыся каля клуні, пачаў піць саракаградусную.

Замітусілася ў вачох баці. Стала яму цёмна і ён, як звар'яцелы палез на сьцяну і нарэшце абсунуўся і заснуў.

У той час, калі баця спаў „блаженным", п'яным сном,—нейкі азарнік абстрыг баці на галаве палову валос.

Цераз некалькі дзён баця М. выехаў з Станькава незаплаціўшы крамніку за паўлітра саракаградуснай.

Койданаўскі р., Менакругі.

Іваст. Макарэвіч.

Закахаўся.

Вясна. Сонейка сьвеціць і прыгравае. Ня хочацца працаваць. Цягне на вуліцу... Сьледчы 5 вучастку Аршанск. акругі М. Б. Разьнік у гэты час сядзіць у сваёй канцэлярыі. Перад ім груда розных спраў... Калі іх скончышь. Праца не малая, а тут яшчэ вясна не дае працаваць. Сьледчы чалавек ужо пажылы, мае жонку, дзяцей. Але „любви все возрасты покорны" і сьледчы закахаўся, так закахаўся, што забыўся ўсё: дзяцей, жонку і службу.

Разьнік ня можа жыць без сваёй каханкі, ён езьдзіць у Коханаўскі раён, але робіць гэта, як сьледчы, каб не змагі падкапацца—жонка і знаёмыя. З Коханава ён, нібыта на справам, едзе ў Конысь, але ў Воршы „памыліўшыся" сядзіць ня ў той цягнік і „выпадкова" пападае да свае любой зноў.

Каб захаваць няскончаныя сьледчыя справы, якія з кожным днём павялічваюцца, ад пракурорскага вока, Разьнік робіць махінацыю: справы запісвае як скончаныя, хавае іх, а пракурору паказвае невялічкую „колькасьць. Усё ўпарадку. Пракурор нічога не знайшоў. Можна і далей кахацца

А ў гэты час, калі сьледчы сядзіць, п'е гарбату з малінавым варэньнем і закусвае пацалункамі, натоўпы сялян асаджваюць канцэлярыю сьледчага. Дзелавод ня ведае, што ім казаць, бо ён ня ведае і ня можа знайсьці іх спраў. Ён прапануе ім наведацца яшчэ раз. А некаторым кажа што справа скончана і накіравана ў суд, бо аб гэтым кажа адзнака самога Разьніка. Сяляне едуць у суд, у Воршу, туды сюды. Нідзе нічога нямa. Справа нібы загінула.

Так цягнулася амаль што цэлы год. Гара няскончаных спраў расла, сяляне абівалі парогі канцэлярыі сьледчага, раённых і акруговых устаноў, судоў і г. д. Ездзілі, трацілі сродкі і працоўныя дні, а іх справы тым часам ляжалі ў сьледчага захаванымі.

Так цягнулася-б можа і яшчэ, але ў Аршанскай пракуратуры вельмі стала многа наведальнікаў па справам, якія не разадзены сьледчаму Разьніку.

Узяліся за Разьніка і ён ня стаў запіраца, сазнаўся.

Цяпер слова сваё скажа суд.

А. Калюжны.

Плян ня выканан.

Плян збору паявых узносаў па сельска-гаспадарчай каапэрацыі акругі ў першым паўгодзьдзі выконваўся зусім слаба. Замест таго, каб сабраць паеў 93.800 р. сабрана усяго 20.900 руб., што складае 21,7 проц. і спэцкапіталаў сабрана 4.200 р., што складае 12 проц. Па машынных таварыствах спагнана паеў 2.500 руб. замест вызначаных на пляну 10.400 р., што складае 23,9 проц.

Такі слабы збор паёў тлумачыцца тым, што Акрсельсаюз ня ужыў своечасова рашучых захадаў, каб забясьпечыць спагнаньне паеў поўнасьцю.

Каб выканаць плянавыя меркаваньні ўжо хоць у апошнім квартале, Прэзыдыум Акрвыканкому запрапанаваў Акрсельсаюзу устанавіць штодзённы кантроль над нізавой сеткай у галіне выкананьня пляну па збору паявых узносаў і спэцкапіталаў. Да тых работнікаў каапэрацыі, якія ня выканаюць плянавыя меркаваньні, прымяніць адміністрацыйныя меры ўзьдзейнічаньня, альбо прыцягваць да судовай адказнасьці. Тыя-ж працаўнікі, якія выканаюць плян на ўсе сто процантаў будуць прэміраваны.

Райвыканкомам і Камітэтам сялянскай узаемадапамогі таксама запрапанавана прыняць з свайго боку ўсе захады, каб плянавыя меркаваньні па збору паеў і спэцыяльных капіталаў былі выкананы поўнасьцю.

А. К.

Пад контроль савецкай грамадзкасьці.

рганізацыйны пэрыяд, уздым гас- рчай ініцыятывы і зацікаўленасьці ыцка-серадняцкага сялянства, не- днасьць і магчымасьць больш рка разгарнуць мерапрыёмствы па тэхнічнай рэканструкцыі скай гаспадаркі—патрабуюць з рашучасьцю новых форм працы. я новыя формы ў аснове сваёй ць мэтай уцягненьне ў сацыялі- нае будаўніцтва як мага больш юкія колы бядняцка-серадняцкага нства, узмацненьне гаспадарчай ыятывы і зацікаўленасьці апош- , выяўленьне новых крыніц (а іх ас як матар,яльных, так і чалаве- дужа многа) рэсурсаў і сродкаў, дапамогуць больш пасьпяхова вы- ць нашы пляны. Ужо ў гэту у новыя формы працы і новыя ытуты выявіліся і бязумоўна, сябе ўдаюць. Аграмінімум, як новая ма працы і аграўпаўнаважаныя, як ы інстытут, дапамагаючы больш рка выявіць мясцовыя магчымасьці йсцовую ініцыятыву, у поўнай ы аказаліся жыцьцёвымі. Ня важна, ы тым ці іншым месцы аграўпаў- жаныя працуюць яшчэ дрэнна, ці мінімум ажыцьцяўляецца самімі намі без дапамогі і кіраўніцтва сьсавету і агранома. Усякая новая ма працы, пакуль ня будзе ўдасканана, будзе мець свае хібы. Важна што як ідэя аграмінімуму, так і арэньне інстытуту аграўпаўнаважа- выніклі з жыцьцёвай практыкі, рмлены на грунце ініцыятывы са- сялянства, якое да выданьня па- ноў зьверху само выносіла тысячы таноў аб неабходнасьці правядзень- аграмінімуму.

астанавіцца толькі на існуючых мах працы мы ня можам. Шукань- новых форм, праверка іх на прак- ы і пасьля ўнядрэньня ў шырокім табе—вось штодзённая задача.

гэтых адносінах посьпеху дабіцца мы зможам тады, калі поруч з шуканьнем новых форм працы адначасова прыглядзімся да нашай багатай практыкі ў горадзе сярод рабочае клясы і пашукаем там такіх форм працы, якія з посьпехам могуць быць ужыты на вёсцы. А такіх форм працы, бязумоўна, ёсьць багата. Да аднэй з такіх форм працы належыць грамадзкі кантроль над сродкамі, якія ідуць на капітальнае будаўніцтва. У гарадох, у сэнсе разгортваньня грамадзкага кантролю рабочае клясы над выкарыстаньнем сродкаў, мы дабіліся станоўчых вынікаў. На кожным прадпрыёмстве праз вытворчыя нарады, агульныя сходы, пасьценгазэты і прафсаюзныя арганізацыі рабочыя ажыцьцяўляюць грамадзкі кантроль, змагаюцца за эканомію, папярэджваюць немэтазгоднае скарыстаньне сродкаў, дабіваюцца зьніжэньня сабекошту прадукцыі, мабілізуюць думку наконт больш эфэктыўнага скарыстаньня сродкаў і больш эфэктыўных якасных паказчыкаў нашага будаўніцтва. Грамадзкі кантроль стаў штодзённай працай на кожным прадпрыёмстве, якая значна павышае актыўнасьць рабочае клясы, усіх да аднаго рабочых уцягвае ў практычнае вырашэньне вытворчых пытаньняў таго ці іншага прадпрыёмства, робіць немагчымым ня толькі злоўжываньні ці безгаспадарчасьць, але нават (пакуль што на паасобных прадпрыёмствах) папярэджвае кожную магчымую дробную памылку.

Разгортваючы працу па пабудове сельскай гаспадаркі, нам ужо даўно пара выкарыстаць на вёсцы вопыт рабочае клясы ў горадзе, даўно пара разгарнуць грамадзкі кантроль над выкарыстаньнем сродкаў, якія ідуць у сельскую гаспадарку. Гэты грамадзкі кантроль зьявіцца тэй формай працы, якая значна падштурхне наперад ініцыятыву бядняцка-серадняцкага сялянства, узьніме гаспадарчую зацікаўленасьць апошняга, паможа больш рашуча і пасьпяхова выправіць хібы зямельнага і каапэрацыйнага апарату.

Ужо ЦВК СССР у сваёй пастанове пра ўзьняцьце ўраджайнасьці, адзначаючы, **„што ня гледзячы на шэраг пастаноў вышэйшых урадавых органоў, пытаньням павялічэньня ўраджайнасьці і прадукцыйнасьці сельскай гаспадаркі ў працы мясцовых органаў савецкай улады да апошняга часу аддаецца надта малая ўвага"**, даў шэраг канкрэтных паказаньняў наконт працы саветаў у гэтай галіне. Сярод гэтых паказаньняў ёсьць паступны пункт:

„Скарыстаньне сродкаў, якія накіроўвае савецкая ўлада ў сельскую гаспадарку, паставіць пад такі самы грамадзкі кантроль, пад які рабочыя ў гарадох ужо ставяць капітальнае будаўніцтва".

Ці выконваецца гэтая пастанова ЦВК СССР? Мы не памылімся, калі скажам, што ў справе выкананьня яе нічога ня робіцца. І калі зараз у сувязі з разгортваньнем сацыялістычнага будаўніцтва, у сувязі з неабходнасьцю ўцягненьня ў гэта будаўніцтва шырокіх мас ставіцца пытаньне аб новых формах працы на вёсцы, то зусім правільна будзе сказаць аб неабходнасьці выкарыстоўваньня вопыту пралетарскага гораду і выкананьня тых дырэктыў, якія дадзены, але чамусьці да гэтага часу ня выконваюцца.

У сельскую гаспадарку савецкая ўлада накіроўвае вялікія сродкі. З году ў год гэтыя сродкі павялічваюцца, і аб'ём мерапрыёмстваў па перабудове сельскай гаспадаркі расьце. Сродкі ідуць на цэлым шэрагу крыніц, з якіх найбольш важнымі трэба лічыць дзяржаўны бюджэт, сельска-гаспадарчы крэдыт, мясцовы бюджэт, адліччэньні ад прамысловасьці і г. д. Складанасьць мерапрыёмстваў, раскіданасьць апошніх у сувязі з характарам сельска-гаспадарчай вытворчасьці часта зьяўляецца тормазам у справе шырокай інфармацыі бядняцка-серадняцкага сялянства аб мерапрыёмствах, якія мы праводзім, і сродках, якія мы адпускаем на іх. Але калі мы хочам, каб кожная тысяча, што адпускаецца дзяржавай, прыцягвала ў вытворчасьць дзесяткі тысяч сялянскіх сродка ў то першай умовай павінна быць належная інфармацыя як аб мерапрыёмствах, так і сродках, што на іх адпускаюцца. Яшчэ больш выразна гэтай інфармацыі патрабуе эфэктыўнае скарыстаньне ўкладаньняў, бо інакш кантроль над скарыстаньнем

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

ПРА НАЗНАЧЭНЬНЕ УПАЎНАВАЖАНАГА САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР ПА АСЕНЬНЯЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе назначыць Народнага Камісара Земляробства тав. Рачыцкага, Піліпа Мікалаевіча, Упаўнаважаным Савету Народных Камісараў БССР па асеньняй пасеўнай кампаніі 1929 году.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР М. КАРКЛІН.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР М. КАЛЕВІЧ.

12 чэрвеня 1929 году.
г. Менск.

БОЛЬШ САМАДЗЕЙНАСЬЦІ У БАРАЦЬБЕ З СУХОТАМІ

(ДА ТРОХДЗЁНЬНІКА ПА БАРАЦЬБЕ З СУХОТАМІ).

Калі мы праводзім традыцыйны трохдзёньнік па барацьбе з сухотамі, нам асабліва карысна застанавіцца на пытаньні аб самадзейнасьці працоўных, як на адным з важнейшых фактараў, які можа перамагчы гэтую сацыяльна-бытавую хваробу. Сухоты—адна з тых хвароб, на паходжаньні якой асабліва адбіваецца сацыяльна-бытавы ўклад жыцьця. Тут, як на далоні, ясна відаць, наколькі дзяржава прымала ўдзел у зьнішчэньні ўсяго таго, што шкодна адбівалася на здароўі рабочага і селяніна, як дзяржаўная ўлада праводзіла санітарныя законы аб ахове працы, і як, наадварот, разьвівалася ўся палітыка ўлады ў галіне шырокіх аздараўляючых мерапрыёмстваў. Вось чаму ў асноўным за дзяржавай застаецца пераважнае значэньне ў справе барацьбы з сухотамі. Правільна пабудаванае жыльлё і прадастаўленьне кватэр у ім у першую чаргу працоўным, таннае і добраякаснае грамадзкае харчаваньне, нармальныя ўмовы працы на заводзкіх прадпрыёмствах—вось галоўнае, у чым павінна выяўляцца сталае, энэргічнае ўмяшацельства органаў дзяржаўнай улады. У нашых умовах, калі ля ўлады знаходзіцца рабочая кляса, усё гэта робіцца ў межах тых эканамічных магчымасьцяй, якія ў сучасны момант ёсьць. Але як-раз тыя абставіны, што гаспадаром краіны зрабіліся самі працоўныя, ускладаюць на апошніх і асаблівыя задачы.

Індустрыялізацыя краіны патрабуе новых кадраў здаровых людзей і гэта-ж індустрыялізацыя прымусіць асабліва ўважліва аднесьціся і да таго кантынгэнту людзей, які будзе працаваць на новых заводах. Дзеля гэтага пытаньні аб пабудове новых заводаў, у якіх павінны быць захаваны ўсе неабходныя санітарныя нормы аховы працы, стануць ва ўсю шырыню перад працоўнымі. Вытворчыя нарады, камісіі па ахове працы, прафсаюзы—павінны ва ўсю шырыню зацікавіцца новым прамысловым будаўніцтвам і добра прадумаць усе дэталі, усе драбніцы, якія ў тэй ці іншай ступені могуць мець уплыў на здароўе працуючых. Іншы раз забытая фортачка, кепска прыгнаная рашотка ля рабочага варштату, адсутнасьць гатаванай вады для піцьця, умывальнікаў, цёплай уборнай і г. д.—можа няпрыкметна з году ў год падточваць сілу рабочага арганізму, калечыць яго і весьці да захворваньня на сухоты.

Тое-ж самае адносіцца і да сялянскай працы. Не гаворачы аб вельмі негігіенічных умовах, у якіх жыве наш селянін на вёсцы, уся яго праца таксама ня ўкладваецца ў нашы санітарныя нормы, і ў яго жыцьці ёсьць шмат таго, што можа дапамагчы разьвіцьцю сухотаў. Праўда, праца селяніна пераважна адбываецца на чыстым паветры. Але гэтыя спрыяючыя абставіны трацяць сваё практычнае значэньне, паколькі быт селяніна зьяўляецца зусім антысанітарным.

Мы павінны ў трохдзёньнік па барацьбе сухотамі, як і раней, весьці шырокую кампанію на аздараўленьні сялянскага быту, бо толькі гэта дасьць магчымасьць спыніць распаўсюджваньне сухотаў на вёсцы. Тэта кампанія толькі тады будзе пасьпяховай, калі на дапамогу доктару прыдуць усе грамадзкія арганізацыі, якія працуюць у вёсцы. Чырвоны Крыж, санітарныя камісіі сельскіх саветаў, Саветы Сацыяльнай Дапамогі пры вучастковых лекава-профілактычных установах павінны энэргічна ўзяцца ў гэтыя дні ня толькі на словах, але і на справе за генэральную чыстку сялянскага быту.

Асаблівая ўвага нашай савецкай грамадзкасьці на вёсцы павінна быць зьвернута на сацыялістычную базу на вёсцы,—калгасы і савгасы. У нашых прапановах, якія рабіў НКАЗ Кал. Гас. Саюзу, гаварылася аб стварэньні ў асобных калектыўных гаспадарках ячэек па ахове здароўя. Таксама прадугледжвалася і стварэньне спэцыяльнага грашовага фонду для накіраваньня хворых на курорты і наленшаньне бытавых умоў. Неабходна ў дні трохдзёньніка на барацьбе з сухотамі добра праверыць, наколькі ўсё гэта праводзіцца ў жыцьцё, і там, дзе яшчэ гэтага няма, неадкладна прыступіць да арганізацыі паказаных мерапрыёмстваў. Мы павінны нашы калгасы і савгасы зрабіць паказальнымі гаспадаркамі ва ўсіх адносінах. Санітарны бёк пры гэтым ні ў якім выпадку не павінен быць забыты. Наадварот, неабходна на прыкладзе калектыўнага сэктару довесьці нашаму сялянству ўзор таго дабрабыту ў санітарным сэнсе, які магчыма стварыць толькі тады, калі наша вёска адмовіцца ад дробнай індывідуальнай гаспадаркі.

Шырокая самадзейнасьць працоўных дазволіць НК Аховы Здароўя лягчэй справіцца з вялікімі задачамі, якія стаяць перад ім у сэнсе прадастаўленьня хворым на сухоты лекавай дапамогі. Трэба заўсёды памятаць, што больніцамі, санаторыямі, як бы многа іх ня было, мы ня справімся з ліхам—сухотамі. Толькі шырокая прафілактыка, папярэджваньне захворваньня на сухоты, якое праводзіцца самімі працоўнымі, можа выратаваць для сацыялістычнага будаўніцтва каштоўнае жыцьцё рабочых і сялян.

М. Барсукоў.

ЗА РАЗЬВІЦЬЦЕ ВЫСОКА-ПРАДУКЦЫЙНАГА ПТУШНІЦТВА.

У БЛІЖЭЙШЫЯ ГАДЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БССР БУДЗЕ АРГАНІЗАВАНЫ ШЭРАГ ПТУШНІЦКІХ ЗАВОДАЎ І РАССАДНІКАЎ.—ЗБЫТАВЫЯ ФУНКЦЫІ ПРАДУКТАЎ ПТУШНІЦТВА БУДУЦЬ СКАНЦЭНТРАВАНЫ Ў РУКАХ СПЭЦЫЯЛЬНАЙ КААПЭРАЦЫІ.

У даваенны час з Беларусі вывозіліся ў значных разьмерах яйкі ды іншыя прадукты птушніцтва, прычым гэтыя прадукты ў агульным с.-г. экспарце краіны складалі 2,5 проц.

Вываз прадуктаў птушніцтва ў даваенны перыяд з былой Росеі дасягаў 6,9 проц. ад усяго с.-гасп. экспарту. З гэтага відаць, што Беларусь у даваенны час значна адставала па экспарту прадуктаў гэтай галіны сельскае гаспадаркі.

У апошнія гады вываз з БССР прадуктаў птушніцтва за межы наладзіўся.

З кожным годам экспарт прадуктаў птушніцтва набывае ўсё большую актуальнасьць. Урад БССР надае вялікае значэньне разьвядзеньню гатунковай птушкі, як больш прадукцыйнай.

Пачынаючы з сёлетняга году, у БССР арганізуецца цэлы шэраг птушніцкіх заводаў-множнікаў. Па лініі Белсельтрэсту канчаецца пабудова буйнага птушынага заводу ў савгасе Сеньніца, Менскай акругі, у якім ужо сёлета ёсьць да 1000 штук маладняка. Да лістапада мае быць пабудаваны гэткі-ж завод у савгасе Любна, Гомельскай акругі.

Пабудова і абсталяваньне заводу ў Сеньніцы будзе каштаваць 110000 р., а заводу ў Любне—120000 руб. На лета мяркуецца распачаць будаўніцтва такога-ж заводу ў адным з савгасаў Магілёўскай акругі.

Апрача разьвядзеньня курэй, гусей і качак, значная ўвага аддаецца разьвядзеньню трусоў пэўных гатункаў, скуркі якіх высока расцэньваюцца на замежных рынках. Тут маюцца на ўвазе такія гатункі, як „белы вялікан" і „шыншыла". Гатункі гэтых трусоў ужо ёсьць на нашых заводах.

Наогул жа, кожная гаспадарка па лініі НКЗ разьлічана на ўтрыманьне 1000 курэй-матак, 400 гусей-матак, 100 качак-матак і 300 трусоў.

Другой арганізацыяй, якая зацікаўлена ў пашырэньні гатунковай птушкі, зьяўляецца Ўправа Дзяржаўнага Гандлю, якая актыўна ўзялася за племянную справу. У Курасоўнічыне гэта арганізацыя ўжо пабудавала птушына-трусны завод, які абсталёван па апошнім слове тэхнікі і зараз зьяўляецца ўзорным у БССР. Апроч гэтага, такі-ж завод будуецца ў Полацку.

У наступным годзе па лініі Ўправы Дзяржаўнага Гандлю маюць быць пабудаваны яшчэ 4 такія заводы. У кожных з гэтых заводаў-множнікаў будзе знаходзіцца па 1000 курэй, па 300 штук вадзяной птушкі і па 100 трусоў.

Зусім слушна, што такое масавае выгадаваньне маладняка магчыма толькі штучным спосабам—г. зн. праз інкубатары, што ўжо праводзіцца сёлета ў Сеньніцы і Курасоўнічыне.

Далейшае распаўсюджваньне гатунковай птушкі будзе накіравана праз спэцыяльныя рассаднікі-рэпрадуктары. Гэтыя рассаднікі будуць арганізаваны па лініі калгасаў. Сёлета мяркуецца арганізаваць 50 такіх рассаднікаў-рэпрадуктараў, а на лета—яшчэ 60.

Усяго за 5-цігодку павінна быць арганізавана ў БССР 350 рассаднікаў-рэпрадуктараў, на што вызначана 787000 руб.

Птушніцтва будзе пашырацца і праз жывёлаводную каапэрацыю, якая арганізуе спэцыяльныя птушніцкія т-вы—па 1 т-ву на кожны райён. Сёлета арганізуецца 34 такіх т-ваў. У працягу 5-цігодзьдзя ўсе райёны БССР павінны быць ахоплены працай гэтых таварыстваў.

ХРОНІКА.

2-я Ўсебеларуская нарада літоўскіх партпрацаўнікоў.

Учора а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні ЦК КП(б)Б адчынілася Ўсебеларуская нарада літоўскіх партпрацаўнікоў. На нарадзе прысутнічае 40 дэлегатаў, у гэтым ліку—прадстаўнікі рабочых літоўскіх арганізацый Ленінграду, Масквы і Харкава.

На абвестцы дню нарады стаяць вельмі важныя пытаньні: 1) Справаздача літбюро ЦК КП(б)Б, 2) калектывізацыя літоўскай вёскі, 3) праца сярод літоўскай бедноты, 4) палітыкаваньне і 5) антырэлігійная праца сярод літоўскага насельніцтва.

Па першым пытаньні з дакладам выступіў сэкратар Літбюро ЦК КП(б)Б тав. Бучукас, які спыніўся на палітычным і эканамічным становішчы літоўскага працоўнага насельніцтва БССР і на працы сярод беднаты.

Гаворачы аб культурнай працы сярод літоўскага насельніцтва, тав. Бучукас зазначыў, што ў БССР ёсьць: літоўскіх пачатковых школ—22, чырвоных куткоў—17; сёлета адчыняецца 1 хата-чытальня і школа літоўскай сялянскай моладзі.

Апрача гэтага, дакладчык спыніўся на ўзмацненьні сувязі з літоўскімі рабочымі арганізацыямі Амэрыкі, Аргэнтыны і Нямеччыны. Нарада працягнецца 3 дні.

Камсамольцы выклікаюць.

Агульны сход камсамольскай ячэйкі пры АКРЗА прыняў наступныя мерапрыёмствы па сацыялістычнаму спаборніцтву:

Ня спыняць збору попелу камсамольцамі гэтай ячэйкі. Растлумачваць насельніцтву значэньне сацыялістычнага спаборніцтва. Камсамольцам правесьці індывідуальнае спаборніцтва паміж сабою на сваім галінам. Выпусьціць шэраг насьценгазэт з пытаньнямі сацыялістычнага спаборніцтва і па іншым пытаньням.

Ячэйка выклікае на спаборніцтва наступныя ячэйкі: друкароў, Акрфа, ячэйку Экімань (Полацкага райёну).

УДЗЕЛ БССР У МІЖНАРОДНЫМ ПЛЯНЭРНЫМ СПАБОРНІЦТВЕ.

ЦС ТДА-Авіяхіму БССР пасылае на міжнароднае плянэрнае спаборніцтва, якое адбудзецца сёлета ў Крыму, 1 плянэр-спаборнік.

Гэты плянэр пабудаваны студэнтамі-аматарамі БДУ з ячэйкі ТДА-Авіяхіму БДУ. Ляцець на плянэры выбіраецца кіраўнік гуртка студэнт Шаапан.

Калгас „Чырвоны Астраханец".

Чырвонаармейцы № коннага палка арганізуюць пасьля дэмабілізацыі калгас „Чырвоны Астраханец".

Пад гэты калгас адводзіцца 560 гэкт. зямлі.

Лодачны прабег Днепр—Бярэзіна.

У ліпені—жніўні па р. р. Днепр—Бярэзіна будзе арганізаваны прабег лодкі, якая прыводзіцца ў рух паветранай шрубою (глісэрны прабег). Лодку пабудавае адзін з гурткоў ТДА-Авіяхіму Магілеўскай акр.

Захаваньне жыльлёвага пляцу.

Прэзыдыум Менскага АВК узбудзіў хадайніцтва перад СНК БССР аб выданьні пастановы аб тым, каб усе арганізацыі, якія жадаюць будавацца на занятых пляцох, за свой кошт пераносілі старыя дамы ў іншае месца, каб такім чынам захаваць жыльлёвы пляц.

Курсы клюбных працаўнікоў.

5-га ліпеня адчыняюцца ўсебеларускія клюбныя курсы на 60 чалавек. На курсы будуць прымацца рабочыя ад варштату.

Чыстка вясковых арганізацый КП(б)Б.

Ва ўсе райёны Менскай акругі выяжджаюць 17 камісій, у складзе 51 чалавека, для правядзеньня чысткі вясковых арганізацый КП(б)Б. Усе таварышы, якія былі вылучаны ў праверачныя камісіі, прайшлі праверку на куставых сходах у Менску.

24-га чэрвеня камісіі прыступаюць да сваёй працы. Чыстка пачнецца адначасова ва ўсіх райёнах.

КІНО.

„ПЭРЛЫ СЭМІРАМІДЫ".

(«Пралетары").

Падобную нізкапробную халтуру рэдка можна спаткаць на экране. У гэтай карціне, вытворчасьці ВУФКУ, усё фальшыва ад пачатку да канца. Пастаноўшчык дапускае бязьмерныя „вольнасьці". Так, заваёва паўднёвых тэрыторый прадстаўлена як нейкае "шуточное предприятие", а не як упартая барацьба за новыя рынкі, новыя ўладаньні.

Войска Кацярыны II (фільм з гэтай эпохі) брала крэпасьці такія, якія разбурала... кватухта з куранятамі! Пастаноўшчык таксама зусім скажае сацыяльна-эканамічны сэнс абезьзямеленьня казацтва, ускладаючы адказнасьць за гэта абезьзямеленьне на плечы буржуазеі, а не дваранства. Фальшыва абмалёваны і тып заваёўцы нават у тым штучным асьвятленьні, якое дапушчана ў фільму. Ня лепш і запарожцы—яны шаблённы.

Агідна паказана жанчына. Так, гэраіня (Зулейка) паказана ледзь ня прастытуткаю, прагавітаю на грошы і прадажнаю. Паказваючы першага бурмістра, першага хабарніка і г. д. пастаноўшчык не дагаварыў, што гэта—протэтып прастытуткі, а такі вывад напрашваецца.

Вельмі нізкае і мастацкае афармленьне фільму.

Пошла паказваць такія рэчы, як губляньне парток ад перапуду і інш.

У пастаноўшчыка шовіністычны падыход да нацмоманту. Благія расійцы і грэкі, добрыя—запарожцы: толькі туркі ёсьць і благія і добрыя, але паказаны дрэнна.

Габ.

„САВ. БЕЛАРУСЬ" ДАПАМАГАЕ

ЛЖЭКАЛГАС РАЗАГНАНЫ.

У допісе „Гісторыя Лжэкалгасу" „Піянэр", ці водгук рэформы Лабанаўскага", селькор Анучыц паведамляў наступнае: З 1921 г. каля мястэчка Камень існуе лжэкалгас, які арганізаваны былымі Лепельскімі „дзельцамі" і туды пралез былы абшарнік. Карыстаючыся правамі калгасу, лжэкалгасьнікі маюць вялікую колькась зямлі і займаюцца розныміганд лёвымі справамі. Справа разглядалася на пасяджэньні Асобнай Калегіі Вышэйшага Кантролю, якая пастанавіла зямлю лжэкалгасу перадаць у дзяржаўны фонд.

ЗЬНЯТ З ПЭНСІІ.

Па допісу „Каму даюць пэнсіі", („Савецкая Беларусь" № 92) у якім паведамлялася, што гандляр Хайкін атрымлівае ад аддзелу сацыяльнага забесьпячэньня пэнсію, як інвалід, было ўтворана расьсьледаваньне. Расьсьледаваньнем факты пацьвердзіліся. Пастановай Магілеўскага Горсавету Хайкін з ліку пэнсіянэраў выключан.

АНТЫСЭМІТА ВЫГНАЛІ.

У допісе „Талочынская сямігодка" паведамлялася аб хворых зьявішчах талочынскай сямігодкі.

Рассьледаваньнем устаноўлена наньне клясавай лініі пры прыняў, несваечасовае аказаньне вучням-беднякам, выпадкі п'яных настаўнікаў і антыпэдагагічных вучняў. Выкладчык мастацтва былы ўдзельнік яўрэйскага падводзіў антысавецкую працу, на разьяднаньне нацыянальнас

Згодна пастанове калегіі РСІ, загадчык школы Шчарбо працы і яму забаронена ў гадоў займаць адміністрацыйн Настаўніка Галубовіча пастаноў з працы і забараніць яму зай настаўніка. Настаўнікаў Куле кую, Рашыкова, Туркова і Ш новага навучальнага году пе іншыя школы.

Да ведама беспрацоўных

Камісія па чыстцы беспрацоўных Разумовай Сэкцыі Біржы Працы вызывае на 21 чэрвеня г. г., а 6 гадзіне ўвечары наступных таварышоў:

Глайхенгауз Гірш Кадышаў, Ліўшыц Ася Іосіфаўна, Готлібовіч (рахункавод) праж. па Чычэрынскай вул., Касіла (біліцёр Дзяржтэатру), Розін Ісак, Маскалевіч Усевалод, Пік Міра (прыказчыца), Ідэльчык Элька (рахункавод), Солобінзон Эстэр (машыністка), Перэльман (прыехаўшы з Смілавіч), Волін Ізраіль Самуйлаў, Залатавіцкая Ал-дра Саламонава, Раговін Беніямін Іцкаў, Гут Уладзімір Фролаў, Гут Беньямін Іцкаў, Масьян Мацьвей Мацьвеяў, Мірановіч Мікола Пятроў, Сарадзінскі Ігнат Юстынаў, Рэхін Мікола Дзьмітраў, Брусьцін Усцін Ісакаў, Катляроў Барыс Бэркаў, Сымановіч Базыль Карпаў, Садоўскі Дзямян Сьцяпанаў, Дзяменьцьяў Цімафей Якубаў, Касьперскі Антон Антонаў, Кобазаў А. І. (былы працаўнік НКЗ), Кабайла Л. Л. (былы працаўнік НКЗ), Слаук П. П. (былы працаўнік НКЗ), Хлебковіч П. І. (былы працаўнік НКЗ), Іваноў А. Ф. (былы працаўнік НКЗ), Леўчанкаў П. Л. (былы працаўнік НКЗ), Гарадзінская Діна Рамась Яўгеній (былы прац. Акр Рэзмысловіч (настаўнік), Калечыц нік) Пігулеўскі (настаўнік), Ал (настаўнік) Янкоўскі (былы пра пляну), Тугановіч Пётра (жыв. скай вул.), Крэйсман Кушэл Арцішэўскі Леонцій, Лукашэвіч Запольскі Ян і Дабравольскі К

Камісія па чыстцы просіць служачых і беспрацоўных п тыўны ўдзел у чыстцы беспра

Адначасова вызываюцца тав. брыгады, якія вытваралі абс і распрацоўку матар'ялу на чы

Камісія па

Што слухаць па радыё.

ПЯТНІЦА 21-га ЧЭРВЕНЯ.

18—00 18—30 Час акцябрат.
18—30 18—50 Гутарка па фізкультуры д-ра Душмана.
18—50 19—15 Музычны адпачынак.
19—15 19—30 Інфармацыя СНК БССР.
19—30 20—20 Беларуская радыё-газэта
20—20 20—45 Гутарка Старшыні Цэнтральнага Статыстычнага ўпраўленьня аб становішчы пасеваў на Беларусі.
21—00 23—00 Канцэрт.

СУБОТА 22-га ЧЭРВЕНЯ.

18—00 18—45 Пасьляабедзенны канцэрт
18—45 19—00 Даклад на польскай мове.
19—00 19—30 Перадача для работніц, сялянак і хатніх гаспадынь.
19—30 20—20 Беларуская радыё-газэта.
20—20 20—40 Даклад.
20—40 22—30 Канцэрт са студыі.
22—30 23—30 Замежныя станцыі.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 21 ЧЭРВЕНЯ 1929 Г.

	Пакуп.	Прад.
1-я 6 проц. залат. выйгр. пазыка	4.85	—
2-я 6 проц. залат. выгр. паз.	5.00	—
Бяспроц. залат. выйгр. пазыка 1926 г.	125 —	127 —
10 проц. дзярж. выйгр. пазыка 1927 г.	25.98	26.03
6 проц. дзярж. выйгрыш. пазыка Індустр.	25.42	25.52
3-я сялянск. выйгр. пазыка 1927 г.	5.01,5	—
12 проц. дзярж. унутр. пазыка 1927 г.	100.66	—
2-я 6 проц. паз. проц. вып.	26.60	26.70
Пазыка Індустр. бяспр.	25.84	25.94
11 проц. дзярж. унутр. паз. 1928 г.	103.35	103.40
Дзярж. пазыка 29 г.	102 10	102.50

Паштовая скрыня

Воку. Лампэцкаму і Ведаўшаг „Мэтады Даманавіцкай каапэр памаглі прыватніку"і„Антысэмі кіраваны Калінкавіцкаму РК К

Шыпёнку. „Дакуль будзе"— У далейшым у допісах паказва вішча і аб кім пішаце.

Лапу. „Як ідзе"—ня пойдзе справе ўжо ёсьць выгкі.

Кліншаву, Г. Турову, А. Н. і Допіс „Дайце адказ" накіраван скаму Акраза, „Самагон"—Пухав міліцыі, „Далоў валакіту"—Мен гандслужачых, „Самаабкладаны бінскаму РВК, „Замест бедна кінскаму РВК.

Віру, Аленіну, Кейгельсу, Бар Сродкіну. Допісы—„У калектыв чога" накіраваны Ліцянска „Ня лечыць" — Мазырскаму „Дакуль-жа будзе" і „Савецкая —Горанкаму РК КП(б)Б, „Вар ца"—Уваравуской раймілыцы.

Апавяшчэньне.

— Сёньня а 2-й гадзіне дня каньні ЦП Саюзу працасьветы з нарада адказн. сакратароў і к-к ГРН і МК гораду Менску зьявіцца таксама і т. т., што на экскурсію на Урал. Пуйа абы

ГАБІНЭТ ПАЛІТ-АСЬВЕТУ.

— 24 чэрвеня ў 10 гадзін Габінэце Паліт-Асьвет-Працы (Ра адбудзецца агульна - тэрадная загадчыкаў і настаўнікаў вечар павыш. тыпу і рабочай моладзі і малапісьм.

ПАРАДАК ДНЮ:

1. Справаздача 2-ае вач. шк. т. Масляковуў.
2. Справазд. 1-ае шк. раб. тав. Гуцько.
3. Справаздача 3-я шк. пав. т Гершанбаўм.
4. Аб рэарганізацыі школ—д вуменка (інап. НКА).

Да ўсіх загадчыкаў і ст просьба не пазьвіцца.

Час. вык. аб. адказн. рэд
П. ШАСТ

Тэатр—кіно—цырк

ТЭАТР „ПРАФІНТЭРН"

У СЕРАДУ, 26 чэрвеня, ТОЛЬКІ АДЗІН КАНЦЭРТ

К. І. КАВАЛЬСКАГА

НА ТЭРМІНАВОКСЕ.

Тэрмінавокс—гэта новая электра-музычная прылада, на якой граюць рухам рукі ў паветры, не датыкаючыся да інструмента.

Падрабязнасьці ў афішах. Пачатак а 9 гадз.

Білеты ў рабочай касе ад 12 да 2 і ад 4 да 6 гадз., у дзень спэктаклю ў садзе „Прафінтэрн" ад 6 гадз. вечара.

САД «ПРАФІНТЭРН»

Гастролі Ленінградзкага „Красного Театра"
У пятніцу, 21 чэрвеня
„ХОЛЩЕВЫЕ ШТАНЫ"
Пачатак а 8 з пал. гадзіне ўвечары. Білеты ў рабочай касе.

Цырк. ПЯТНІЦА, 21 ЧЭРВЕНЯ
Выключная ў сэзоне праграма
З УДЗЕЛАМ
НОВА ПРЫБЫЎШЫХ ГАСТРАЛЁРДУ
З прычыны грандыёзнай праграмы пачатак роўна а 9 гадз. увечары.
Па заяўках фабкомаў і мясцкомаў—скідка.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА" — СЁНЬНЯ І ШТОДНЯ МАСТАЦКІ БАЯВІК **„КАЛАМУТА".** Пачатак а 8 гадзіне.

КІНО-САД «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» Савецкая № 71. — 3 АЎТОРКА, 18 ЧЭРВЕНЯ. Вялікі мастацкі —) баявік (— **„ХРОМОЙ БАРИН".** Штодня 2 сэансы. Пачатак 1-га—9 гадз. 2-га—10 г. 30 хв.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». — 3 аўторка, 18 чэрвеня ГРАНДЫЁЗНЫ МАСТАЦКІ БАЯВІК **„ЛАВІНА".** Аповесьць у 7 частках. Пачатак а 8 гадзіне.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ — Мастацкі гістарычны фільм **„Пэрл Семіраміды".** Драма ў 7 частках.)—(Пачатак а 7 з пал. гадзіне.

АД ПРАЎЛЕНЬНЯ ДЗЯРЖСТРАХУ БССР.

Згодна пастановы ЦВК і СНК СССР ад 24-IУ—29 году (36. Зак. СНК СССР 1929 г. арт. 266, № 29),

дзяржаўнаму абавязковаму неакладному страхаваньню падлягаюць

БУДЫНКІ

якія знаходзяцца ў веданьні мясцовых саветаў, але арандуюцца дзяржаўнымі органамі.

На падставе гэтага ПРАЎЛЕНЬНЕМ ДЗЯРЖСТРАХУ БССР дадзена распараджэньне страхавым агэнцтвам

аб безадкладным прыцягненьні вышэйпаказаных будынкаў да страхаваньня.

З свайго боку ўсе дзяржаўныя ўстановы і прадпрыёмствы, у арэндным карыстаньні якіх знаходзяцца памянёныя будынкі,

павінны паклапаціцца аб іх застрахаваньні, НЕ ЧАКАЮЧЫ паведамленьняў страхавых агэнцтваў.

Пры Менскім Акруговым Інспэктарыяце Нарасьветы
АДЧЫНЯЮЦЦА
4-хмесячныя настаўніцкія курсы на 75 асоб.
На гэтыя курсы прымаюцца асобы з адукацыяй ня ніжэй 9-ці годкі, члены саюзу, беспрацоўныя, сяляне і інш.
Прыём заяў да 25 чэрвеня г. г. у інспэктарыяце.

АБВЯШЧАЕЦЦА КОНКУРС ТЭРМІН 2 ТЫДНІ.
НА ЗАМЯШЧЭНЬНЕ ПАСАДЫ
ЗАГАДЧЫКА АДДЗЕЛУ ПРЫСТАСАВАНЬНЯ
пры Цэнтральнай Бульбяной Станцыі Беларускага Навукова-Дасьледчага Інстытуту імя ЛЕНІНА
пэнсія—150 р. у месяц.
Задвы і дакуманты накіроўваць па адрасу:
Менск, Шырокая 23, Канцэлярыя БНДІ імя Леніна.
ДЫРЭКЦЫЯ ІНСТЫТУТУ.

СЯЛІБСКАЕ СПАЖЫВЕЦКАЕ ТАВАРЫСТВО
ГЭТЫМ АБВЯШЧАЕ, ШТО
ЗГУБЛЕНЫ ніжэйпаказаныя апратэставаныя і аплачаныя потым вэксе

Тэрмін пратэсту	КАМУ ВЫДАДЗЁН ВЭКСАЛЬ	Тэрмін аплаты	СУМА	Месца а
9-I-25 г.	Цэнтрабелсаюзу	4-I-25 г.	180 р. —	Дзяржб Менск
9-II- „	Тэкстыльсындыкату	5-II- „	252 р. —	„
3-II- „	Менск—Акрсаюз	30-I- „	135 р. —	„
5-III- „	Тэкстыльсындыкату	5-III- „	252 р. —	Праміб. Н
8-X-27 г.	Бэрштэйн	3-X- „	186 р. 40 к.	Дзяржб.
9-XI- „	Менск—Акрсаюзу	3-XI- „	177 р. 03 к.	„
24-XII „	Цэнтрасаюз	21-XII „	180 р. —	Белсел Менск
3-IX-28 г.	Белкаапсаюзу	30-VIII „	100 р. —	„
6-У-29 г.	„	30-IV „	100 р. —	„

Старшыня праўленьня ФРЭЙНКМАН.

ПРАМЫСЛОВА-КААПЭРАЦЫЙНАЯ АРЦЕЛЬ ВАТНАЙ ВЫТ ЧАСЬЦІ „КРАСНЫЙ УТИЛИЗАТОР" ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТ
13 ЧЭРВЕНЯ г. г.
АРЦЕЛЬ ЛІКВІДУЕЦЦА.
Усё абсталяваньне і машыны перайшлі да 21-й арцелі інвалідаў «БС
Усе пратэзіі павінны быць прад'яўлены ў працягу 2-х тыдняў, па гэтага тэрміну пратэзіі прымацца ня будуць.

ЗГУБЛЕНЫ.

Асабовая кніжка за № 1188 Жыльскага П.—выд. Каралінскім РВК, кв. 359-п.

Дзьве вучотна-вайсков. кніжкі за № 3308 і № 2351 Курацэвіча С. Д.,—выд. Жыткавіцкім РВКП, кв. 360-п.

Камсамольскі білет за № 29432 Каваленка Г. М.—выд. Калінінскім Акругкомам КСМ, кв. 361-п.

Бесправацоўная карт. Пінхасіка Х. Х.—выд. Барысаўск. Біржай Працы, кв. 362-п.

Качагарскае пасьведчаньне, выд. упаўнав. Зах. раёну і Беларусі па навучэньню кача гараў на імя Міхалковіча В. Я кв. 363-п.

Сяброўская кніжка выд. Барысаўск. К-там Узаемадапамогі; 2) Мэтрычная спраўка выд. Барысаўскім ЗАГСам; 3) 7-мі гадовы стаж Амніліўскага с.-сав. Плешчаніцк. РВК з 1919 г. па 1926; 4) 4-х мес. стаж Нова-Барысаўск. чыгункі ахраны 4 узвода з 12-XII—27 г. па 15-VI—28 г. на імя Ліцьвіновіча С. В., кв 364-п.

Вучотна-конская карт. Блізьнюка І. Р.—выд. Чэрвенскім вайсковым сталом, кв. 365-п.

Пашпарт Бейненсон А. М.—выд. Менакрміліц., кв. 783.

Сяброўскі білет № 278 Дразда А. А.—выд. Ц. П. Саюзу Працасьветы, кв. 782.

Вайсковам кніжка Каранчука І. Менакрваенкамат, кв. 784.

Асабова-вайсковая кніжка, выд. Б скім Ваенкаматам; 2) Сяроўск за № 1113, выд. саюзам дрэвап у 1926 г. на імя Кальвана П. Я. к

Сяброўская каапэрац. кніжка Чарнуха М.—выд. Барысаўск. родн. т-вам, кв. 367-п.

Конская кніжка за № 3121 Троц выд. Каралінскім РВК, кв. 368-

Асабова-вучотна вайсковая чырв кніжка Хоміча В. М.—выд. 4-м назн. палком, кв. 369-п.

Вучотна-конская карт. Муха М. А Зембінскім РВК, 370-п.

Асабова-вучотна вайсковая чырв кніжка нарадж. 1895 г., Клінск выд. Смалявіцкім РВК за № 12 371-п.

Сяброўская кніжка Гінзбурга З.—с юзам хімікаў, кв. 372-п.

Працоўная кніжка Айзенбэрга Д выд. Мазырск. міліц., кв. 373-п.

Сяброўская кніжка за № 52 Ш Ц. Г.—выд. саюзам харчавік 374-п.

Паявая кніжка Шыліка М. С.—вы ліцінкавіцк. ТНО Зах. чыг.

Паявая кніжка Кантарозіч Г. М Калінкавіцк. спаж. т-вам.

Пасьведчаньне асобы Валовіча С выд. 1-й дзярж. друкарні, кв 78

Галоўлітбел 595